Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№201 (28565)

18 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 9–16



**У вас празмерная трывожнасць?**

СТАР. 5



**Поўны асартымент** МС



**Апавяшчальнік для ветэрана** МС

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір КАРАГІН, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва:**

*«Многія нашы прапановы знайшлі падтрымку ва Указе №376 «Аб мерах па ўдасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці», які падпісаны Прэзідэнтам 16 кастрычніка. Ён ствараўся складана, але Камітэт дзяржкантролю, Мінэканомікі і МАРГ былі на баку разнявolення дзелавой ініцыятывы і зніжэння прадпрымальніцкай рызыкі. Прыняты ўказ — гэта карысны дакумент і важны крок у бок падтрымкі тых суб'ектаў, якія вядуць канструктыўную гаспадарчую дзейнасць. Для мінімізацыі магчымых парушэнняў будзе весціся папераджальная і прафілактычная работа. Трэба ў першую чаргу растлумачваць і дапамагаць пазбегнуць памылак пры вядзенні прадпрымальніцкай дзейнасці, а не караць, што з'яўляецца пазітыўным сігналам для бізнесу».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9592 | ▲ |
| Еўра | 2,3064 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0341 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0740 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ТАЦЦЯНІН ДЗЕНЬ



**Таццяна ДЗЯНІСАВА-БЕРАШЭВІЧ з вёскі Цыганкі Сенненскага раёна працуе сацыяльным работнікам. А яшчэ яна старэйшына ажно пяці невялікіх вёсак. Наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук правёў з гэтай жанчынай, якую заўсёды чакаюць, яе працоўны дзень. Чытайце і глядзіце яго фотарэпартаж у новым выпуску «Мясцовага самакіравання».**

■ Жыць цікава!

## «АБСТАЎЛЮ ЛЮБОГА МАЛАДОГА!»

### Гісторыі беларусаў, якія працуюць пасля 90 гадоў

**«Інтэрв'ю? Ну, толькі калі хутка, а то ў мяне вельмі шмат работы», — сказаў адзін з нашых герояў, калі тэлефанавалі дамовіцца на сустрэчу. А яму, між іншым, 94 гады! У Беларусі 21 чалавек працягвае працаваць пасля 90. Пра выбар прафесіі і навуковыя дасягненні, сакрэт даўгалецця і ранішнюю фізкультуру расказалі вядомыя медык і акадэмік, якім узрост — не перашкода.**



Фота Надзеі БУЖАН.

**Прафесар Леанід Сцяпанавіч Вялічка: «Пытаюцца, чаму на пенсію не сыходжу. Дык цяпер рай для спецыялістаў!»**

### «Машыну перастаў вадзіць толькі ў красавіку»

**Леаніду Сцяпанавічу ВЯЛІЧКУ, прафесару кафедры артапедычнай стаматалогіі БДМУ**, 92 гады. Яшчэ да сёлетняга мая ён — прэтэзіст па спецыяльнасці — прымаў пацыентаў. Цяпер займаецца навуковай і метадычнай работай, часам вядзе заняткі ў студэнтаў.

У медыцыну Леанід Сцяпанавіч прыйшоў 70 гадоў таму. Адвучыўся ў Мінскай зубаўрачэбнай школе і паехаў па размеркаванні ў родны Старобін.

СТАР. 4

## АД БЛУЗ І КАРТАК ДА АЛЕЮ І ПІЛОВАЧНІКА

### Што набываюць на айчыннай таварнай біржы?

**Апошнія гады сусветны інтэрнэт-гандаль перажывае бум: кожны дзень з'яўляюцца сотні новых анлайн-пляцовак, маркетплэйсаў, на якіх можна купіць або прадаць усё што заўгодна і ў любой колькасці. Кожны новы гулец на гэтым рынку ўсімі сіламі імкнецца адкусіць хоць бы невялікі кавалак ад гэтага вялізнага пірага. Нягледзячы на канкурэнцыю з боку такіх гігантаў, як Alibaba, Amazon і eBay, не засталася ў баку ад агульнасусветных тэндэнцый і наша краіна. Іх беларуская альтэрнатыва была створана дзякуючы Беларускай універсальнай таварнай біржы (БУТБ).**

Некалькі гадоў таму на біржы з'явілася свая электронная пляцоўка прамысловых і спажывецкіх тавараў (ПСТ). Працуе яна на стыку біржавога гандлю і электроннай камерцыі і з'ўляецца свайго роду гібрыдам біржы і інтэрнэт-партала для аптовых закупак. Таргі тут праводзяцца кругласутачна ў анлайн-рэжыме, а асартымент тавараў абмяжоўваецца толькі фантазіяй і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб абароце зброі, наркатычных сродкаў, псіхатропаў і іншай падобнай «прадукцыі». Таму на таргі нярэдка выстаўляюцца абсалютна небіржавыя тавары: ліфты, дарожныя знакі, спецвопратка, электраінструменты, прадукты харчавання і многае іншае. Пры гэтым у сілу таго, што пляцоўка ПСТ арыентавана на аптовы гандаль, сумы здзелак часам аказваюцца значнымі. У БУТБ «Звяздзе» расказалі пра пяць найбуйнейшых здзелак гэтага года з незвычайнымі для біржавых таргоў таварамі.

СТАР. 3

# АБАРОНА АГУЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з Сяргеем Нарышкіным, дырэктарам Службы знешняй разведкі Расійскай Федэрацыі

**Беларускі лідар прыгадаў, што з Сяргеем Нарышкіным яны нямала спрацавалі над стварэннем і ўмацаваннем Саюзнай дзяржавы. Асабліва калі той займаў пасаду старшыні Дзяржаўнай Думы Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі.**

— Вы з'яўляецеся заўзятым прыхільнікам гэтай формы існавання нашых брацкіх дзяржаў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Я гэта вельмі цаню. І самае галоўнае — наколькі дэпутаты вашы, якія прыязджалі на саміты, былі адданыя гэтай ідэі. Для мяне гэта вельмі важна.

Цяпер Сяргей Нарышкін узначальвае іншую структуру.

— Вельмі важную, хаваць тут няма чаго, — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Мы ў самым шчыльным кантакце працуем. Я інфармаваны пастаянна па ўсіх гэтых пытаннях. Я таксама вам удзячны за супрацоўніцтва нашых разведслужбаў па абароне нашых інтарэсаў. Мы абараняем інтарэсы нашых дзяржаў і нашых народаў — як і ўсе спецыяльныя службы ў любой дзяржаве.

Так ці інакш, адзначыў Прэзідэнт, ёсць пэўныя пытанні — пытанні каардынацыі, узгаднення нейкіх кірункаў работы па абароне інтарэсаў абедзвюх дзяржаў.

— Сёння ў нас ёсць магчымасць абмеркаваць гэтыя праблемы, — канстатаваў Прэзідэнт.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### У тэму

**Сяргей НАРЫШКІН, дырэктар Службы знешняй разведкі Расійскай Федэрацыі,** па выніках сустрэчы звярнуў увагу, што яў гэты ж самы дзень у Мінску праходзіла сумеснае пасяджэнне калегій КДБ Беларусі і Службы знешняй разведкі Расіі. Гэта, адзначыў ён, унікальны фармат узаемадзеяння спецслужбаў дзвюх дзяржаў. Такога органа ў Расіі няма ні з адной іншай краінай, запэўніў Сяргей Нарышкін.

— І Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, і Уладзімір Уладзіміравіч Пуцін падтрымліваюць самае цеснае супрацоўніцтва дзвюх спецслужбаў і зразумела, чаму, — падкрэсліў дырэктар Службы знешняй разведкі Расіі. — Перад нашымі дзвюма краінамі агульныя пагрозы: міжнародны тэрарызм, кіберзлачыннасць, інфармацыйныя пагрозы, неправавы санкцыйны рэжым. Пераадольваць гэта разам лягчэй.

Гаворачы пра знешнія ўмовы вакол Саюзнай дзяржавы, Сяргей Нарышкін адзначыў, што абстаноўка «вельмі цікавая і дынамічная»:

— Сітуацыя не вельмі простая. Гэта абавязвае нас яшчэ больш шчыльна працаваць разам, дабівацца тых мэт, якія стаяць перад нашымі краінамі.

# «ПРЫМАНІЦЬ» УДАЧУ

## Вызначыліся з формай для алімпійцаў

**Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з узорамі парадной формы беларускіх спартсменаў для выступлення на зімовых Алімпійскіх гульнях. Нагадаем, яны пройдуць у карэйскім Пхёнчхане ў лютым 2018 года. Былі прадстаўлены дзве канцэпцыі.**

Аўтар першай — дызайнер Людміла Лабкова з канцэрна «Беллегпрам». Яе работа — гэта камплекты набораў мужчынскага і жаночага адзення, выкананыя ў светла-шэрых колерах з акцэнтам на чырвоныя аксесуары — сумкі, абутак, рамяні, гузікі.

Аўтар другой — Юлія Латушкіна, што працавала сумесна са швейным атэлье пры Галоўным гаспадарчым упраўленні Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. Яе мадэлі — больш дзелавыя, выкананыя ў чорных і чырвоных колерах. Дарэчы, менавіта Юлія Латушкіна распрацавала форму нашых алімпійцаў для гульняў у Рыа-дэ-Жанэйра.

Аляксандру Лукашэнку спадабаліся абедзве канцэпцыі, але перавага была аддадзена першай — як больш зручнай для спартсменаў. Тым не менш Прэзідэнт зрабіў распараджэнне аб масавым пашыве абодвух варыянтаў адзення — у хуткім часе касцюмы паступяць ва ўсе буйныя універмагі краіны і стануць даступныя любому ахвотнаму іх набыць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

### У тэму

**Людміла ЛАБКОВА, галоўны дызайнер «Беллегпрама»:**

— Я ўзяла арнамент, які сімвалізуе маці, — абярэг. І дадала туды элементы, што сімвалізуюць удачу, поспех і ўраджайнасць. Арнаменты ў беларускай культуры маюць вельмі выразнае значэнне.

Ва ўрадзе

# ПАЙСЦІ Ў РОСТ

## Савет Міністраў падвёў вынікі работы эканомікі краіны за дзевяць месяцаў бягучага года

**ВУП да таго ж перыяду 2016-га склаў 101,7% пры такім жа гадавым прагнозным паказчыку. Добра спрацавалі прамысловасць, сельская гаспадарка, гандаль, але пакуль адстаюць будаўнічамантажныя работы. Таксама падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў гутарка ішла пра рост заробатнай платы і пенсій па ўзросце, стварэнне новых працоўных месцаў.**

«У цэлым у студзені-верасні бягучага года з задачай справіліся, — заявіў **прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ**, каментуючы сітуацыю з ВУП. — Агульная сітуацыя ў эканоміцы застаецца стабільнай, выконваюцца амаль усе ключавыя паказчыкі эфектыўнасці работы ўрада і Нацыянальнага банка». Расце вытворчасць па ВУП, працягвае павялічвацца экспарт. Збалансаваны знешні гандаль. Інфляцыя за 9 месяцаў склала 2,7%. «Гэта мінімальны паказчык за ўсю нашу суверэнную гісторыю Беларусі», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Крэдыты для рэальнага сектара эканомікі працягваюць таннець. У верасні сярэдняя працэнтная стаўка па новых крэдытах для юрыдычных асоб склала 12,3% гадавых (у пачатку года — 20,8%). Захоўваецца тэндэнцыя росту рублёвых дэпазітаў насельніцтва — прырост на 11,9% за 9 месяцаў. Станоўчыя тэндэнцыі ў астатніх галінах эканомікі таксама захоўваюцца. У прамысловай вытворчасці рост у 6,1%, у параўнанні з мінулым перыядам паказчык не змяніўся. Сельская гаспадарка спрацавала лепш, чым летась, на 1,7%. Тут важна замацаваць вынік і выйсці па годзе на мэтавую задачу ў 102,2%, лічыць прэм'ер. «Рэальная заработная плата за восем месяцаў перывысіла ўзровень аналагічнага перыяду мінулага года на 3,2%», — паведаміў Андрэй Кабякоў.

Разам з тым узровень намінальнай заработнай платы ніжэйшы, чым прадугледжана планам-графікам па выхадзе да канца года на 1000 рублёў. За жнівень сярэдняя зарплата склала 844,4 рубля, згодна з графікам гэта павінна было быць 896 рублёў. Зарплаты ўжо выраслі ў бюджэтнікаў і ваенных, пытанне па нізкааплатных катэгорыях работнікаў бюджэтнай сферы будзе дадаткова разгледжана.

Але мэтавыя задачы выканалі не ўсе. Гэта датычыцца асобных сфер прамысловасці, а ў сельскай гаспадарцы — абласцей: крыху недабралі Брэсцкая, Гомельская і Мінская. Самае высокае невыкананне па секцыі будаўніцтва — яе ўплыў на ВУП -0,4%. А калі б гэты сектар працаваў на ўзроўні мінулага года, ВУП склаў бы 102,1%.

Акрамя таго, прэм'ер заклікаў актывізаваць будаўніцтва жылля з выкарыстаннем механізма субсідавання, актыўней ствараць новыя працоўныя месцы, а таксама хутчэй сабраць ураджай з палёў. «Стаўлю задачу: лён павінен быць сабраны да суботы 21 кастрычніка, да 31 кастрычніка з палёў павінна быць сабрана ўсё астатняе. Прашу губернатараў прыняць меры па пад'ёме зябліва. Араць трэба кругласутачна», — паставіў задачу кіраўнік урада.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## КНДР зноў палохае вайной

Сітуацыя на Карэйскім паўвостраве дасягнула крытычнай адзнакі з-за дзеянняў Злучаных Штатаў, у любы момант у рэгіёне можа пачацца ядзерная вайна. Пра гэта заявіў прадстаўнік КНДР пры ААН Кім Ян Рон на пасяджэнні 1-га камітэта Генеральнай Асамблеі.

Паводле яго слоў, ні адна краіна не зазнавала «настолькі экстрэмальнай і прамой ядзернай пагрозы з боку ЗША», як КНДР, і ў гэтай сітуацыі Пхеньян мае поўнае права на самаабарону. «Уся кантынентальная частка ЗША знаходзіцца ў межах дасягальнасці нашай агнявой моцы, калі ЗША асмеляцца хоць бы на цалю ўварвацца на нашу святую тэрыторыю, яны не пазбегнуць жорсткага пакарання ні ў адной частцы свету», — сцвярджаў Кім Ян Рон.

Сітуацыя на Карэйскім паўвостраве абвастрылася ў апошнія месяцы, асабліва пасля правядзення Пхеньянам у ліпені двух выпрабаванняў балістычных ракет, якія і КНДР, і ЗША кваліфікуюць як міжкантынентальныя. Савет Бяспекі ААН прыняў дзве рэзалюцыі, якія робяць больш жорсткім рэжым міжнародных санкцый у дачыненні да Пхеньяна.

Акрамя таго, КНДР заявіла аб магчымасці правядзення ў хуткім часе ядзернага выпрабавання ў Ціхім акіяне, а прэзідэнт ЗША Дональд Трамп прыгразіў поўным знішчэннем краіны.

## Парашэнка прапануе адмяніць дэпутацкую недатыкальнасць

Адпаведны законапраект зарэгістраваны ў аўторак у Вярхоўнай Радзе і ўжо перададзены на разгляд камітэта, яго статус вызначаны як «неадкладны».

На пасяджэнні кіраўнікоў фракцый парламента спікер Рады Андрэй Парубій, заявіў, што, у адпаведнасці з прапановай прэзідэнта, «недатыкальнасць павінна была зняткая, яна не мае права на існаванне».

Цяпер канстытуцыя Украіны гарантуе парламентарыям дэпутацкую недатыкальнасць. У прыватнасці, іх без згоды Рады не могуць прыцягваць да крымінальнай адказнасці, затрымліваць, арыштоўваць.

Пазбаўленне дэпутатаў недатыкальнасці — адно з асноўных патрабаванняў удзельнікаў усеўкраінскай акцыі пратэсту, якія ў аўторак сабраліся ў цэнтры Кіева. Акрамя таго, мітынгоўцы, як заявіў кіраўнік партыі «Рух новых сіл» Міхаіл Саакашвілі, патрабуюць змяніць сістэму выбараў ва Украіне, у прыватнасці перайсці да прапарцыянальнай сістэмы з адкрытымі спісамі, абмежаваць палітычную рэкламу на тэлебачанні, а таксама стварыць антыкарупцыйныя суды.

## «Мацільда»: Генпракуратура Расіі не супраць

Генеральная пракуратура Расіі не знайшла падстаў для ўмяшання ў вытворчасць кінафільма рэжысёра Аляксея Учыцеля «Мацільда», паведаміла гэтае наглядное ведамства.



«У ходзе разгляду Генеральнай пракуратурай РФ звароту дэпутата Дзярждумы Наталлі Паклонскай аб магчымых парушэннях заканадаўства пры вытворчасці названай кінакарціны падстаў для ўмяшання органаў пракуратуры не ўгледжана», — гаворыцца ў паведамленні.

Пры гэтым у ведамстве адзначылі, што пракуратура разам з іншымі ведамствамі прымае меры па недапушчэнні парушэнняў закона і правой грамадзян у сувязі з маючым адбыцца выхадам карціны ў пракат.


**Извещение о проведении 30 октября 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего МО ОАО «Луч» – управляющей компании холдинга «Обувь – «Луч»**

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов без учета НДС | Размер задатка |
| Помещение клуба общей площадью 636,6 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 500/D-708165508 | г. Минск, ул. Немига, 30/1-2 | 1 107 480,00 бел. руб. | 110 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** МО ОАО «Луч» – управляющая компания холдинга «Обувь – «Луч», ул. Короля, 2, АБК, каб. 415, 220004, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов**:

победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов;

дальнейшее использование недвижимого имущества осуществляется согласно генеральному плану г. Минска с указанием в договорах купли-продажи сроков вовлечения в хозяйственный оборот отчужденного недвижимого имущества и ответственности за нарушение предусмотренных условий продажи;

дальнейшее использование недвижимого имущества осуществляется с учетом требований «Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры» по сохранению памятника архитектуры и обеспечению комплексного научного подхода к проведению работ по его ремонту (техническое обследование, ремонт конструктивных элементов здания, инженерных сетей, реставрация фасада);

при передаче недвижимого имущества другому балансодержателю последний обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности на материальную историко-культурную ценность или возникновения права за земельный участок, на котором расположена недвижимая материальная историко-культурная ценность, подписать охранное обязательство в соответствии с пунктом 2 статьи 75 «Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры».

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего МО ОАО «Луч» – управляющей компании холдинга «Обувь – «Луч», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 30 октября 2017 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 18.10.2017 по 27.10.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 200-12-65, 200-43-92, 226-56-55 (МО ОАО «Луч» – управляющая компания холдинга «Обувь – «Луч»)

# А ВЫ МАЕЦЕ КАРТКУ САЦЫЯЛЬНАГА СТРАХАВАННЯ?

## Будуць унесены змяненні ў закон, каб усе атрымалі права на пенсію

**Нядаўна ў Беларусі пашырылі спіс відаў дзейнасці, пры якіх фізічным асобам не трэба рэгістравацца ў якасці ІП — пры ўмове выплаты адзінага падатку. Але, як аказалася, калі не ўнесці змяненні ў заканадаўства, гэтыя людзі ў будучыні не змогуць разлічваць на пенсію.**

— Права на атрыманне бальнічнага ліста, дапамог па цяжарнасці і родах і ў сувязі з доглядам дзіцяці да трох гадоў, а таксама права на пенсійнае забеспячэнне маюць толькі тыя асобы, у якіх ёсць картка сацыяльнага страхавання і якія выплачваюць узносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, — паведаміў на прэс-канферэнцыі **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ.**

Ён растлумачыў, што сацыяльнае страхаванне можа быць абавязковым і добраахвотным. Абавязковае сацыяльнае страхаванне распаўсюджваецца на ўсіх грамадзян, якія працуюць па працоўных дагаворах і па грамадзянска-прававых дагаворах, калі адным з бакоў з'яўляецца юрыдычная асоба. Пад абавязковае сацыяльнае страхаванне таксама падпадаюць індывідуальныя прадпрымальнікі і некаторыя іншыя катэгорыі грамадзян. Добраахвотна могуць удзельнічаць у сацыяльным страхаванні творчыя работнікі, рамеснікі, асобы, занятыя ў агратурызме, а таксама тыя, хто працуе за мяжой. Яны могуць зарэгістравацца ў ФСАН і выплачваць узносы, тым самым фарміруючы свае правы ў галіне сацыяльнага страхавання (пры гэтым ідзе страхавы стаж для прызначэння пенсіі і г. д.).

Але, як аказалася, некаторыя катэгорыі грамадзян, якія ажыццяўляюць дзейнасць без рэгістрацыі ў якасці ІП, не падлягаюць сацыяльнаму страхаванню — гэтых катэгорый проста няма ў адпаведным законе. «Зараз дзяржаўныя органы вывучаюць пытанне атрымання такімі грамадзянамі магчымасці фарміраваць свае правы ў галіне сацыяльнага страхавання», — паведаміў Валерый Кавалькоў.

Дарэчы, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны адзначыў, што многія людзі недаацэньваюць значнасць сацыяльнага страхавання. Напрыклад, больш за дзве тысячы жыхароў Беларусі займаюцца аграэкатурызмам, і з іх толькі 6 чалавек выплачваюць узносы ў ФСАН. Права добраахвотнага сацыяльнага страхавання маюць рамеснікі, але сярод іх толькі крыху больш за 230 чалавек зарэгістраваліся ў ФСАН і выплачваюць страхавыя ўзносы. І толькі 550 беларусаў, якія працуюць за мяжой, добраахвотна выплацілі ў мінулым годзе ўзносы ў ФСАН. Між тым гэта — неабходная ўмова для атрымання права на пенсію па ўзросце ў будучыні.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

# Школьнікі некалькі дзён каталіся на ўкрадзеным аўто

**На сталічнай вуліцы Ясеніна нарад патрульна-пастовай службы міліцыі Маскоўскага РУУС звярнуў увагу на аўтамабіль БМВ 525, у якога пры здзяйсненні развароту заглух рухавік.**

Калі супрацоўнікі міліцыі спыніліся побач, каб даведацца, ці не патрабуецца дапамога, кіроўца і пасажыр уцяклі, кінуўшы аўто. Супрацоўнікі міліцыі звязаліся з уладальнікам машыны. Высветлілася, што аўтамабіль ужо некалькі месяцаў знаходзіўся на стаянцы, бо быў у тэхнічна няспраўным стане. Жанчына і не падазравала, што яе аўтамабіль сагналі.

У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў асобы школьнікаў былі ўстаноўлены. Пасля затрымання яны растлумачылі, што даўно звярнулі ўвагу на аўтамабіль БМВ, які стаяў на адным месцы ўжо некалькі месяцаў, і вырашылі, што ён нікому не патрэбны. Хлопцы ўскрылі дзверы, у салоне знайшлі запасны ключ, але завесці аўтамабіль не змаглі: быў разраджаны акумулятар. Зарадзіўшы яго дома, яны некалькі дзён каталіся на ўкрадзеным аўто па вуліцах раёна.

У дачыненні да дзевяцікласнікаў заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# РУХАВІК ПРАГРЭСУ

## У Мінску адкрылася выстава рэкламы

**У спецыялізаванай выставе рэкламы, дызайну і паліграфіі «Мятны леў» удзельнічае больш за 20 кампаній. Гэта дзелавая пляцоўка для брэндынгавых агенцтваў і дызайнерскіх студый, друкарняў, пастаўшчыкоў сыравіны і расходных матэрыялаў для паліграфіі, вытворцаў сувенірнай прадукцыі. Разам з выставай у гатэлі «Пекін» адбудзецца канферэнцыя «Маркетынг XXI стагоддзя: трэнды ў стылі ф'южн».**

У цяперашні час на тэрыторыі краіны дзейнічае 1186 рэкламных арганізацый. Фактычна за апошнія 8—9 гадоў іх колькасць павялічылася ў 2,7 раза, паведаміла **начальнік сектара па рэкламе ўпраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ) Іна ГАЎРЫЛЬЧЫК.** Гэта сведчыць аб тым, што і прававыя, і арганізацыйныя ўмовы ў Беларусі для развіцця рэкламнага бізнесу створаны дастаткова добрыя. Кажучы пра выдаткі на рэкламу, прадстаўнік МАРГ адзначыла, што ў першым паўгоддзі 2017 года гэтыя сумы ў айчынных вытворцаў і гандлёвых арганізацый склалі 182,2 млн рублёў (127% у адносінах да аналагічнага перыяду мінулага года). Больш актыўна сёння працуюць з рэкламай вытворцы адзення, аптовы і рознічны гандаль, а таксама вытворцы харчовых прадуктаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

**З днём нараджэння, з 65-годдзем, шчыра віншуем шаноўнага галоўнага рэдактара «Звязды» на працягу не аднаго дзесяцігоддзя Уладзіміра Браніслававіча НАРКЕВІЧА! Зычым добрага здароўя і настрою, бадзёрасці, аптымізму, светлых думак і ўражанняў, самых цёплых і прыемных успамінаў! Такіх, як у нас. Пра вас.**



*Звяздоўцы.*

# АД БЛУЗ І КАРТАК ДА АЛЕЮ І ПІЛОВАЧНІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**1. Дрэнажны геакампазіт маркі «МІАДРЭН-Х 650» на суму больш за 1 млн USD.**



Дрэнажны геакампазіт — дастаткова запатрабаваны матэрыял, які шырока ўжываецца ў сферы дарожнага будаўніцтва. А такая вялікая партыя закуплялася для будаўніцтва другой узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск». Па водапрапускных ўласцівасцях гэты матэрыял пераўзыходзіць традыцыйны друз, што дазваляе не толькі забяспечыць эфектыўны адвод вады, але і знізіць кошт земляных работ.

**2. Лінія па перапрацоўцы піловачніку ў абразныя піламатэрыялы за 576 тыс. USD.**



Лесаматэрыялы займаюць важнае месца ў структуры беларускага экспарту, таму і якасці прадукцыі, што выпускаецца айчыннымі дрэваапрацоўшчыкамі, удзяляецца асаблівая ўвага. Натуральна, для гэтага неабходна сучаснае абсталяванне. Лінію па перапрацоўцы піловачніку набыло дзяржаўнае прадпрыемства лясной гаспадаркі, якое зараз мадэрнізуецца. Гэты набытак — тыповы прыклад такога кшталту інвестыцый. Дзякуючы новай тэхналагічнай лініі лясгас зможа вырабляць высакаякасныя абразныя піламатэрыялы і прадаваць іх еўрапейскім спажыўцам.

**3. Тысяча тон сланцавага алею для насычэння драўніны на 480 тыс. USD.**



Як вядома, драўніна, якой бы якаснай яна ні была, рана ці позна пачынае гніць і разбурацца, перш за ўсё пад уздзеяннем неспрыяльных кліматычных умоў. Гэтая праблема асабліва актуальная для чыгунак, дзе пры будаўніцтве палатна выкарыстоўваюцца драўляныя шпалы. Каб падоўжыць тэрмін службы, іх прамакаюць адмысловымі хімічнымі рэчывамі-антысептыкамі, якія засцерагаюць драўніну ад увільгатнення і загнівання. Да такіх антысептыкаў адносіцца і сланцавы алей: ён таксічны для грыбковых арганізмаў, але абсалютна бясшкодны для жывёл і чалавека. А паколькі гэта рэчыва з'яўляецца адным з асноўных антысептыкаў, якія выкарыстоўваюцца пры вытворчасці шпалапрадукцыі, яго актыўна закупляюць профільныя прадпрыемствы.

**4. 350 тысяч нарыхтовак для плацежных банкаўскіх картак на агульную суму звыш 235 тыс. USD.**

Усе мы карыстаемся банкаўскімі картамі, але ці задумваліся вы, дзе банкі іх бяруць? Вырабляюць самі? Часткова так: у банкаўскіх працэсінгавых цэнтрах адбываецца нанясенне малюнка на карту, а таксама эмбасіраванне (выцісканне) нумара карты і імя і прозвішча яе ўладальніка. Для гэтага выкарыстоўваецца адмысловае абсталяванне — эмбосер. Саму ж пластыкавую аснову карты банк закупляе ў іншых фірмаў. Часам пастаўшчыка «пластыка» шукаюць шляхам правядзення тэндару, а часам звяртаюцца на біржу, дзе кошт сыравіны з-за канкурэнцыі паміж прадаўцамі нярэдка аказваецца ніжэйшы, чым па прамых кантрактах. Акрамя нарыхтовак для пластыкавых карт, банкі таксама актыўна набываюць на біржы і іншую запатрабаваную ў банкаўскай сферы прадукцыю: картрыджы для прынтараў, канцылярскія прылады, матэрыялы для ўпакоўкі каштоўнасцяў і нават бронекамізэлькі.



**5. Жаночыя блузы з кароткім рукавом коштам 74 тыс. USD.**



Звычайна уніформа супрацоўнікаў пэўных арганізацый вытрымана ў адзіным фірмовым стылі і таму закупляецца оптам і, як правіла, у аднаго пастаўшчыка. Калі перад адным з дзяржаўных банкаў паўстала пытанне закупкі 8670 жаночых блуз з кароткім рукавом, ён прыняў рашэнне звярнуцца на біржу. На заяўку адгукнуліся адразу некалькі пастаўшчыкоў, але біржавы дагавор быў заключаны толькі з адным з іх, які прапанаваў самую нізкую цану і самыя выгадныя ўмовы пастаўкі.

Увогуле паслугамі ПСТ прадстаўнікі бізнесу карыстаюцца ўсё часцей, паведамілі ў БУТБ. Усяго на пляцоўцы — больш за 10 тысяч таварных пазіцый. Пры гэтым паняцця «мінімальная партыя» не існуе. А каб стаць трэйдарам, дастаткова атрымаць ключ электроннага лічбавага подпісу.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*


БТА БАНК

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2017 г.

Наименование банка: ЗАО «БТА Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2017 | 01.01.2017 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 4 717 | 4 607 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | – | – |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 4 504 | 3 989 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 6 595 | 11 160 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 30 080 | 37 741 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 57 990 | 58 105 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | – | 21 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | – | – |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 8 875 | 8 325 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | – | 7 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | – | – |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 1 111 | 1 065 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 113 872 | 125 020 |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | – | – |
| 17 | Средства банков | 1202 | 11 856 | 30 504 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 58 197 | 51 403 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | – | 697 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 29 | – |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | – | – |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 316 | 594 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 70 398 | 83 198 |
| 24 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 24 747 | 24 747 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 1 144 | 876 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 6 671 | 6 747 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 10 912 | 9 452 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 43 474 | 41 822 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 113 872 | 125 020 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2017 г.

Наименование банка: ЗАО «БТА Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2017 | 01.10.2016 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 8 717 | 13 310 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 2 496 | 4 286 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 6 221 | 9 024 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 043 | 1 871 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 178 | 232 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 865 | 1 639 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | – | – |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (13) | (56) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 1 122 | 4 671 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (121) | – |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (659) | 2 494 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 301 | 430 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 7 993 | 7 127 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 168 | 194 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 873 | 5 893 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 202 | 1 133 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 671 | 4 760 |

Председатель Правления Доронкевич А. В.

И.о. Главного бухгалтера Ковалева Т. Н.

Отчетность о деятельности Банка в полном объеме размещена по ссылке: http://www.btabank.by/ru/page/667

Дата подписания: 10 октября 2017 г.

ЗАО «БТА Банк». Лицензия НБ РБ №17 от 28.05.2013 г.
УНП 807000071

# «АБСТАЎЛЮ ЛЮБОГА МАЛАДОГА!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Пяць гадоў на перыферыі працаваў, кляпаў каронкі. Матэрыялаў тады ніякіх не было, нават звычайнага гіпсу для злепкаў. А я ведаў, што ў Мінску ёсць гіпсавы завод. Наладзіў з яго работнікамі кантакты, прыязджаў на грузавіку і набіваў мяшкі матэрыялам. А ён жа намакае і зацвярдзявае. Мы што прыдумалі? Бралі вялікую патэльню, ставілі на керагаз і праграявалі гіпс, памешваючы лыжкай, як яечню, — з усмешкай успамінае доктар. — Я прайшоў у сваёй спецыяльнасці з самага нізу, таму з мяне атрымаўся ндрэнны спецыяліст. Кожную рэч мог рабіць уласнаручна.

Атрымліваць вышэйшую адукацыю Леанід Сцяпанавіч паехаў у Кіеў: у Беларусі стаматолагаў у той час яшчэ не рыхтавалі. Дзіўна, але вакансій у сталічных паліклініках для навапечанага кваліфікаванага спецыяліста не знайшлося. Усе месцы былі заняты зубнымі ўрачамі без дыплома інстытута. Таму Леанід Сцяпанавіч уладкаваўся працаваць выкладчыкам у зубаўрачэбную школу, якую сам скончыў.

У свой час гэты славуты ўрач узначальваў кафедру артапедычнай стаматалогіі медінстытута (загадваў ёй 27 гадоў), быў галоўным пазаштатным стаматолагам сталіцы і Міністэрства аховы здароўя. За сваю доўгую практыку Леанід Сцяпанавіч сутыкаўся з рознымі выпадкамі.

— Неяк паступіў да нас танкіст. У баі яго танк загарэўся, мужчына паспеў выскачыць, але застаўся без вуха. Мы зрабілі яму вушную ракавіну з мяккай пластмасы — гэта, між іншым, вялікае мастацтва. Каб штучнае вуха надзейна трымалася, прымацоўвалі яго да абруча. А парык, каб гэтага не было бачна, заказалі ў галоўнага хормайстра опернага тэатра. У мяне былі добрыя сувязі з рознымі спецыялістамі. Дарэчы, падагнаць тую ракавіну па колеры дапамагала грымёроўшчыца з тэатра аперэты.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Леанід Сцяпанавіч і цяпер займаецца даследаваннямі. Вывучае праблему непераноснасці арганізмам матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца пры вырабе пратэзаў.

У кабінеце прафесара захоўваецца шмат гіпсавых злепкаў сківіц і здымкаў пацыентаў. Здаецца, Леанід Сцяпанавіч і цяпер памятае кожнага з іх. «Гэтаму дзіцяці было тры гады, а зубы так і не выраслі, — паказвае ён адну з фатаграфій. — Мы яму пратэз вырабілі: выглядаў вельмі натуральна. Паглядзіце, як хлопчык тут усміхаецца!»

Па слядах прафесара пайшлі і яго ўнукі. Адзін з іх, Леанід Беладзед, нават назваў сваю клініку ў гонар дзядулі — «Любімы стаматолаг», па ініцыялах Леаніда Сцяпанавіча.

Калі пытаемся ў пенсіянера, як яму ўдаецца захоўваць бадзёрасць у такім паважным узросце, ён прызнаецца: у яго сям'і ўсе доўгажыхары. Бацька дажыў да 93 гадоў, а яго брат (дзядзька Леаніда Сцяпанавіча) — да 95.

— Не ведаю ніякіх сакрэтаў. У харчаванні, напрыклад, я дыет асабліва не прытрымліваюся. Гэта цяпер ужо не ем за тры гадзіны да сну, пазбягаю вострых страў... Трэба весці правільны лад жыцця і не перагружаць сябе, — кажа суразмоўнік.

Хобі Леаніда Сцяпанавіча — рыбалка. Куды толькі ён з вудай ні ездзіў, смяецца. Да нядаўняга часу, дарэчы, прафесар сам вадзіў аўтамабіль. Ад машыны адмовіўся толькі ў красавіку гэтага года.

На рабоце ва ўніверсітэце славуты стаматолаг бывае амаль штодня. «У мяне пытаюцца, чаму на пенсію не сыходжу. Дык цяпер рай для спецыялістаў! Столькі магчымасцяў ёсць!»

## «Сакрэт даўгалецця — загартоўка з дзяцінства»

— Я выдатна сябе адчуваю. У разумовай рабоце абстаўлю любога маладога! — заяўляе пры сустрэчы **акадэмік Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі НАН Беларусі Уладзімір Сямёнавіч КАМАРОЎ.**



Фота Надзеі БУЖАН.

**Акадэмік Уладзімір Сямёнавіч Камароў: «У мяне столькі ідэй!»**

Яго працоўны кабінет застаўлены кветкамі. «Разводжу такія, якія лёгка даглядаць. Калі шмат раслін, прыемней працаваць: яны ж даюць кісларод».

Галоўнаму навуковаму супрацоўніку сёлета споўнілася 94 гады. Але ён і не думае выходзіць на заслужаны адпачынак. «У мяне столькі ідэй!» — прызнаецца нам. Цяпер Уладзімір Сямёнавіч піша манаграфію: распрацаваў новы метад вызначэння паверхні мікрапор. Піша выключна ад рукі.

— Так больш думаеш, аналізуеш матэрыял, — тлумачыць навуковец. — Камп'ютар я выкарыстоўваю для пошуку інфармацыі: праглядзець, што зроблена па маім пытанні. І ўсё на гэтым — астатняе трэба самому думаць. Інакш нічога новага не вынайдзеш. У нас такія ёсць, хто спісвае. Іх ніхто і не цытуе. А вось вы кнігу вазьміце «Вялікія хімікі свету» — я ўжо там, разам з Ламаносавым і Мендзялеевым.

Не паверыце, але ў навуку вядомага сёння акадэміка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, прывёў выпадак. Пасля вайны Уладзімір Сямёнавіч падаваў дакументы ў медінстытут. Адрас — Універсітэцкі гарадок.

— Атрымаў паперку з паведамленнем — нават не пагледзеў, што там напісана. Сунуў у кішэню і паехаў здаваць экзамены. Шукаюць мяне ў спісах — няма такога. Просяць паказаць дакумент. А там накіраванне на фізмат. Здаў экзамены на той факультэт і адразу перавёўся на хімфак. Бо выпускнікоў фізмата ў школу па размеркаванні накіроўвалі, а пасля хімфака можна было на завод ісці працаваць ці ў лабараторыю. Вось так і трапіў у навукоўцы, — усміхаецца пенсіянер.

24 гады Уладзімір Сямёнавіч быў дырэктарам інстытута, загадваў лабараторыяй. Але цяпер, кажа, шкадуе, што страціў вельмі шмат часу на кіруючых пасадах: не было калі займацца непасрэдна навукай.

— Няўжо не хацелася выйсці на пенсію, адпачываць за горадам? — пытаемся.

— У мяне было лецішча ў Бараўлянах. Гараж і два паверхі дома над ім. Туалет, кухня — цудоўна. Вада побач. Дык гэта абуза для мяне была: не цягне туды і ўсё! Таму я пры першым выпадку прадаў лецішча за капейкі.

Распарадак дня ў 94-гадовага акадэміка наступны. Раніцай — абавязкова фізкультура. Потым Уладзімір Сямёнавіч ідзе на работу. У кабінеце на адным месцы не заседжваецца, стараецца быць у руху. Калі добрае надвор'е, пасля работы шпацыруе па парку Чалюскінцаў. У астатні час навуковец любіць маляваць: карцін 170, напэўна, стварыў. У асноўным пейзажы.

— Вучыліся ў мастацкай школе?

— Не. Проста з дзяцінства добра маляваў. Мог за пяць хвілін партрэт накідаць. Я яшчэ ў абедзенны перапынак вершы пішу. Пакуль п'ю гарбату, некалькі радкоў можа нарадзіцца.

— У мастацтве патрэбна натхненне. А ў навуцы?

— Таксама. Калі натхнення няма, дык і ідэй не будзе. Мне раней ідэі нават па начах сніліся. Побач з ложкам пакідаў блакнот, ручку і адразу падымаўся запісваць тое, што ўбачыў.

Цікавімся ў навукоўца пра сакрэт даўгалецця. «Мне здаецца, гэта загартоўка з дзяцінства. Бацька і маці працавалі ў калгасе, а мне трэба было за каровамі, курамі, свіннямі глядзець, пра меншых сясцёр паклапаціцца. Увесь час працаваў. Ва ўніверсітэце вагоны разгружаў, каб зарабіць. Потым з Далёкага Усходу прывёз фотаапарат: з хлопцамі ездзілі па вёсках і здымалі сем'і. Тады грошай з'явілася шмат, дзяўчат нават у кіно запрашалі».

— За рацыёнам сваім сочыце?

— Стараюся выключаць тлустае, мучное. Гэта нічога не дае, акрамя лішніх калорый. Я больш люблю розныя салаты. Капусту часта ўжываю і вам рэкамендую. Калі даведаўся, што яна ўтрымлівае вітаміну С больш, чым лімон, здзівіўся. На раніцу раблю салаты з морквы, марской капусты, зеляніны. Мяса разы тры на тыдзень ем. Сала ўвогуле не ўжываю, сыру таксама нямнога. Навошта мне лішнюю вагу набіраць? Толькі дадатковая нагрузка на сэрца. Нават для маладога гэта нядобра.

Некалі Уладзімір Сямёнавіч карыстаўся мабільнікам, але потым аддаў сястры. Прачытаў, што тэлефон дае моцнае электрамагнітнае выпраменьванне, і вырашыў не псаваць сабе здароўе.

Аб адным акадэмік бядуе: не спяшаецца моладзь у навуку. «Аклады ж невялікія, — з разуменнем ставіцца ён. — Хлопцы ўвогуле не прыходзяць. А што дзяўчаты? Каб тварыць навуку, трэба цалкам аддацца ёй. У жанчыны гаспадарка дамашняя, дзеці. Што ад яе патрабаваць? У яе і так нагрузка шалёная. Пра якую навуку яна думаць будзе?»

— З вышыні сваіх гадоў якую галоўную параду можаце даць?

— Трэба, каб жыццё праходзіла не ўпустую, а з карысцю — і для сябе, і для людзей.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*


| | |
|---|---|
| **ООО «Центр Белинвентаризация»**<br>**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** | **• Раздел и установление порядка пользования земельным участком**<br>**• Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**<br>**• Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**<br>**• Оценка всех видов собственности** |

**Извещает о проведении аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ» 8 (0232) 29 51 12**

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (салон сотовой связи) с инв. №350/D-297643, площадью 17,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 47-38. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007000649 площадью 0,1036 га (доля в праве – 1/100). Цель использования – любая, кроме розничной торговли продтоварами | **25 000,00 руб.** | **2 500,00 руб.** |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **По 16 ноября 2017 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Дата, время и место проведения аукциона | **20 ноября 2017 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY71BPSB30121783390109330000 в РД №300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266.<br>Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация».<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 18.10.2017 г. |
| Условия продажи | Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5%. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 3 (три) месяца. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

Для участия в аукционе необходимо представить:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
Пасля ачысткі неабходна правесці вапнавую пабелку ствалоў дрэў. Раствор можна прыгатаваць самастойна (1,5—2 кг гашанай вапны развесці ў 10 л вады) або выкарыстоўваць гатовыя сумесі.

Улічыце: акрылавую пабелку не рэкамендуецца наносіць на маладыя дрэвы.

Пабелку праводзяць пры сухім надвор'і (восенню або ранняй вясной) пры тэмпературы паветра не ніжэй за 2 °С. Папярэдне варта замазаць усе раны і зрэзы на дрэвах садовым варам.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.43 | 18.05 | 10.22 |
| Віцебск — | 7.35 | 17.53 | 10.18 |
| Магілёў — | 7.33 | 17.56 | 10.23 |
| Гомель — | 7.27 | 17.55 | 10.28 |
| Гродна — | 7.58 | 18.21 | 10.23 |
| Брэст — | 7.56 | 18.24 | 10.28 |

## Месяц

*Маладзік 19 кастрычніка.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

*Пр. Аляксея, Дзям'яна, Ерамея, Мацвея, Піліпа, Пятра, Рыгора.*
*К. Ганны, Лукі, Пятра, Юльяна.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




**18 кастрычніка нашай дарагой АЛЕШЦЫ Зоі Фёдараўне, якая жыве ў вёсцы Балотчыцы Слуцкага раёна, спаўняецца 80 гадоў. Мы — дзеці, унукі і праўнукі — ад усяго сэрца віншуем нашу самую любімую матулю, бабулю і прабабулю з юбілеем. Матуля наша родная, гэтыя пяшчотныя радкі — Вам!**

**Самай роднай, самай прыгожай, самай лепшай на гэтай зямлі!**

*Хай смутак у Ваш дом*
*не заходзіць, хай хваробы*
*ідуць стараной.*
*Мы б увесь свет*
*змясцілі ў далоні*
*і Вам падарылі адной!*
*Але і гэтага было б*
*мала, каб аддаць*
*за Вашу дабрыню.*
*Мы ўсё жыццё,*
*наша родная мама, перад*
*Вамі ў неаплатным даўгу.*
*Цалуем Вашыя рукі, дарагая, маршчыкі*
*і сівую прадку валос*
*І нізка просім у Вас*
*прабачэння за боль*
*і сум, што кожны прынёс.*
*Жывіце доўга, чалавек*
*наш любімы, і галоўнае,*
*вядома, — не хварэйце.*

**Вы вельмі патрэбная на свеце для мужа, унукаў, праўнукаў і нас, дзяцей, — паверце!!! Мы ўсе Вас вельмі любім.**



Даты | Падзеі | Людзі

**18 КАСТРЫЧНІКА**

**1867** год — Аляска перададзена ЗША. Яна, адкрытая ў 1732 годзе рускай экспедыцыяй пад кіраўніцтвам М. Гвоздзева і І. Фёдарава, была адзіным уладаннем Расіі ў Паўночнай Амерыцы. Асваенне гэтай тэрыторыі вялося спачатку прыватнымі асобамі, а з 1799 года спецыяльна заснаванай манаполіяй — Руска-амерыканскай кампаніяй (РАК). Да 1864 года па ацэнцы РАК насельніцтва ўсёй расійскай Аляскі і Алеуцкіх астравоў складала да 2,5 тысячы рускіх і да 60 тысяч індзейцаў і эскімосаў. У пачатку XIX стагоддзя Аляска прыносіла даходы за кошт гандлю пушнінай, аднак да сярэдзіны стагоддзя для расійскай імператарскай сям'і стала відавочна, што выдаткі на ўтрыманне і абарону гэтай аддаленай і ўразлівай з геапалітычнага гледзішча тэрыторыі будуць перавешваць патэнцыйны прыбытак. Дагавор аб продажы Расіяй Аляскі і Алеуцкіх астравоў Злучаным Штатам Амерыкі быў падпісаны 30 сакавіка 1867-га, а 18 кастрычніка таго ж года прайшла цырымонія афіцыйнай перадачы Рускай Амерыкі Злучаным Штатам у абмен на чэк на суму 7,2 млн долараў.



**1908** год — нарадзіўся (Украіна) Аляксей Сямёнавіч Бурдзейны, генерал-палкоўнік, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну быў на фронце з чэрвеня 1941 года. Удзельнік абароны Львова, Кіева, Харкава, баёў пад Варонежам, Сталінградскай і Курскай бітваў. З восені 1943 года ваяваў на Заходнім, 3-м Беларускім франтах. Танкавы корпус пад камандаваннем А. Бурдзейнага 26 чэрвеня 1944 года на захад ад Оршы перарэзаў чыгунку і шашу Масква—Мінск, вызваляў Оршу; 3 ліпеня 1944 года першы ўварваўся ў Мінск. Удзельнік вызвалення Літвы, баёў ва Усходняй Прусіі. Да 1974 года знаходзіўся на вышэйшых камандных і адміністрацыйных пасадах у Савецкай Арміі. Ганаровы грамадзянін Мінска. Памёр у 1987 годзе.

**1947** год — у Савецкім Саюзе на дзяржаўным палігоне Капусцін Яр быў ажыццёўлены першы ў СССР пуск эксперыментальнай аднаступеньчатай балістычнай ракеты А-4. Гэта быў першы канкрэтны практычны крок СССР на шляху асваення космасу і стварэння ракетнага шчыта краіны.

**1947** год — нарадзіўся (г. Кобрын) Алег Анатолевіч Стральчонак, беларускі вучоны, акадэмік НАН Беларусі. Аўтар больш чым 180 навуковых прац, 35 вынаходніцтваў. Даследчык у галіне хіміі гармонаў і гарманальнай рэцэпцыі. За стварэнне і ўкараненне ў практыку аховы здароўя радыеіммунных набораў удастоены Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Было сказана

**Алесь ЗВОНАК, паэт:**

*«Свая пара*
*Хвіліне найшчаслівейшай незваротнай,*
*Калі старое прэч ідзе з двара,*
*каб новаму пастукацца у вокны».*

# УСМІХНЕМСЯ

— Бабуля, а што гэта ў вас самагон такі дарагі?

— Гэта крафтавы самагон «гараж эдзішн» — вытрымка 12 дзён!

**Сур'ёзныя адносіны — гэта калі малады чалавек выходзіць з кватэры дзяўчыны з вядром смецця.**

Маршрутка, заходзіць нецвярозы мужык. На пытанне кіроўцы аб аплаце кажа, што ў яго няма грошай. Кіроўца:

— А на гарэлку былі?

— Мяне сябар пачаставаў.

— А чаму на дарогу не даў?

— Ну, чаму ж не даў... — мужык выцягвае з-за пазухі паўбутэлькі гарэлкі.

**— Дарагі, я не здала на правы.**

**— А што заваліла? Тэорыю, практыку?**

**— Інспектара, дрэва і двух дaішнікаў...**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3886.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 кастрычніка 2017 года.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
18 кастрычніка 2017 г. №39 (423)



стар. 3

Калі вясковая хата занядбаная



стар. 7

Як мару зрабіць справай жыцця



стар. 8

«Сацыяльна небяспечная» — не прысуд

ТЭМА ТЫДНЯ

# ПОЎНЫ АСАРТЫМЕНТ

## Ці магчыма выраўняць узровень сельскага і гарадскога гандлю?




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Адзін з найважнейшых аб'ектаў у кожнай вёсцы — безумоўна, крама. Гэта месца, дзе людзі могуць набыць усё неабходнае або заказаць яго прывоз, куды сцякаюцца ўсе мясцовыя навіны.**

**Але важная як сама па сабе наяўнасць крамы, так і якасць, разнастайнасць тавараў, якія яна прапануе. Толькі ў мінулым месяцы гэта тэма двойчы ўзнімалася на самым высокім узроўні.**

стар. 4

У НАГУ З ЧАСАМ

# ПОРУЧ З ІНФАРМАЦЫЙНЫМІ ТЭХНАЛОГІЯМІ

## Магілёўскія дэпутаты ацанілі патэнцыял вобласці ў сферы тэлекамунікацыйнай інфраструктуры

**ІТ-тэхналогіі ўсё больш актыўна ўкараняюцца ў наша жыццё. Яны прымяняюцца ў сістэмах адукацыі, ЖКГ, аховы здароўя, іншых сферах дзейнасці і дазваляюць істотна эканоміць час і грошы. У сваім сёлетнім Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка адным з галоўных напрамкаў назваў паўсюднае ўкараненне новых інфармацыйных тэхналогій. У Магілёўскай вобласці падсумавалі, што робіцца ў гэтым кірунку, і намецілі шляхі далейшага ўдасканалення. Пытанне аб мерах, якія прымаюцца выканаўчымі і распарадчымі органамі вобласці па будаванні і развіцці ў грамадстве тэлекамунікацыйнай інфраструктуры, было разгледжана на трыццатай сесіі абласнога Савета дэпутатаў.**

Яшчэ да пачатку пасяджэння ў фае канферэнц-залы можна было ўбачыць прыклады прымянення інфармацыйных тэхналогій школамі, установамі аховы здароўя, прадпрыемствамі, якія ідуць у нагу з часам і актыўна ўкараняюць на сваіх тэрыторыях усё самае найноўшае і перадавое. Напрыклад, відэакамеры вучэбнай лабараторыі «Заасад» **Магілёўскага агралесатэхнічнага каледжа імя К. Арлоўскага** дазваляюць у рэальным часе дэманстраваць на ўвесь свет, як жывуць зубры жывёлы ў Буйніцкім заасадзе.

— Нас можна ўбачыць у любым куточку зямлі — Амерыцы, Афрыцы, Аўстраліі, — з натхненнем расказваў **дырэктар установы Георгій МАЛІНОЎСКІ** пра плюсы відэасістэмы. — Наш гонар — зубры, гэта сапраўдныя волаты, равеснікі каменнага веку. Яны жывуць у натуральных умовах, 160 гектараў у іх распараджэнні. І ў той жа час мы актыўна прапаноўваем вельмі важную для чалавецтва ідэю: шануйце жывёльны свет, як гэта робім мы, беларусы.

Прадпрыемства «Белтэлекам», добра вядомае нам па шэрагу паслуг, перш за ўсё такіх, як ByFly і ZALA, дэманстравала свой новы трэнд — разумны дом.

стар. 2



ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# ДАКУМЕНТ ПАЦВЯРДЖАЕ НАМЕРЫ

## *Беларусь і Азербайджан дамовіліся паглыбляць узаемадзеянне*

**Парламенты Беларусі і Азербайджана падпісалі сумесную заяву. Свае подпісы пад дакументам паставілі старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч, старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка і старшыня Мілі Меджліса Азербайджана Актай Асадаў.**



Бакі замацавалі свае намеры парламенцкімі метадамі спрыяць пашырэнню і паглыбленню ўзаемадзеяння Беларусі і Азербайджана ў гандлёва-эканамічнай, культурнай, навуковай, адукацыйнай і іншых галінах, якія ўяўляюць узаемную цікавасць, а таксама намеры аказваць усямерную падтрымку развіццю эфектыўнага супрацоўніцтва. Акрамя таго, дакумент пасадзейнічае ўсталяванню міжрэгіянальных сувязяў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** lukashevich@zviazda.by

# РОЎНЫЯ ПРАВЫ ДЛЯ МУЖЧЫН І ЖАНЧЫН

## *Віцэ-спікер верхняй палаты ўзяла ўдзел у міжнароднай канферэнцыі*

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця (МУР) Мар'яна Шчоткіна ўзяла ўдзел у рабоце міжнароднай канферэнцыі «Жаночае прадпрымальніцтва як фактар устойлівага развіцця». Яна адбылася ў рамках Тыдняў устойлівага развіцця — 2017.**

**У мерапрыемстве ўдзельнічалі прадстаўнікі дзяржаўных органаў, навуковых арганізацый, бізнес-супольнасці, грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».**

Асаблівая ўвага была ўдзелена гендарнай эканамічнай роўнасці як адной з важных умоў устойлівага развіцця. На Саміце ААН па ўстойлівым развіцці (Нью-Ёрк, 2015) забеспячэнне гендарнай роўнасці і пашырэнне правоў і магчымасцяў усіх жанчын і дзяўчат абвешчана адной з 17 МУР на перыяд да 2030 года. Таксама быў прадстаўлены нямецкі вопыт у пытаннях кіруючай ролі жанчын у дасягненні Мэт устойлівага развіцця.

Вітаючы прысутных, Мар'яна Шчоткіна адзначыла, што для дасягнення Мэт устойлівага развіцця трэба ў поўнай меры рэалізаваць патэнцыял дзяржавы, грамадства і кожнага чалавека. «Канферэнцыя якраз накіравана на аб'яднанне для вырашэння надзённых пытанняў і наладжвання больш трывалых камунікацыйных сувязяў», — падкрэсліла нацыянальны каардынатар і выказала надзею на тое, што па выніках мерапрыемства будуць выпрацаваны адпаведныя рэкамендацыі.

# ПЫТАННІ, ДАТЫЧНЫЯ СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫІ

## *Іх абмяркоўвалі падчас нарады ў Савеце Рэспублікі*

**У Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова адбылася нарада.**

Падчас яе былі абмеркаваны пытанні, датычныя ўзаемадзеяння органаў мясцовай улады і арганізацый спажыўкааперацыі па фарміраванні даходнай часткі бюджэту і валавога рэгіянальнага прадукту, рэалізацыі заканадаўства, якое рэгулюе дзейнасць арганізацый спажыўкааперацыі, а таксама існуючыя рэзервы развіцця галіны.

У нарадзе ўдзельнічалі прадстаўнікі міністэрстваў эканомікі, антыманапольнага рэгулявання і гандлю, Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў, Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання і Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

# КАЛІ ГАЛОЎНАЕ — УЗАЕМАРАЗУМЕННЕ

## Спікер верхняй палаты правёў шэраг двухбаковых сустрэч

**Мінулы тыдзень быў багаты на міжнародныя падзеі, важныя не толькі для міжкраінавага супрацоўніцтва, але і для сусветнага. Пасяджэнні Савета Парламенцкай асамблеі АДКБ, Савета Міжпарламенцкай асамблеі СНД, а таксама адкрыццё і работа 137-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза — для краін гэта нагода не толькі абмеркаваць надзённыя для арганізацый пытанні, але і сустрэцца з прадстаўнікамі іншых рэспублік. Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, які ўзначаліў беларускую парламенцкую дэлегацыю падчас гэтых мерапрыемстваў, правёў шэраг двухбаковых сустрэч.**

### Наколькі эфектыўна працуем?

На пасяджэнні Савета МПА СНД Міхаіл Мясніковіч выступіў з дакладам, у якім закрануў вынікі Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, які прайшоў 11 кастрычніка ў Сочы. Спікер Савета Рэспублікі канстатаваў наяўнасць цэлага комплексу выклікаў і пагроз як знешняга, так і ўнутранага характару, а таксама звярнуў увагу на неабходнасць удасканалення работы Міжпарламенцкай асамблеі СНД. На яго думку, партнёры СНД — іншыя органы, у тым ліку выканаўчай улады, — павінны больш адказна ставіцца да прынятых на пасяджэннях саветаў кіруючых органаў рашэнняў, асабліва ў частцы іх рэалізацыі. У сувязі з гэтым таксама павінен ажыццяўляцца выразны парламенцкі кантроль за рашэннямі, прынятымі кіраўнікамі дзяржаў, урадаў і кіраўнікамі профільных міністэрстваў і ведамстваў.

«Другое — тое, што датычыцца ўніфікацыі і гарманізацыі нацыянальных заканадаўстваў. Прымаючы мадэльныя законы, яны, у прынцыпе, нядрэнныя, мы іх улічваем у сваёй практычнай дзейнасці, але што прымаюць нацыянальныя парламенты, — мы не ведаем. Няма зваротнай сувязі», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. З улікам гэтага спікер прапанаваў праводзіць у краінах, якія ўзаемадзейнічаюць у МПА СНД, маніторынг, які пакажа, наколькі эфектыўна ажыццяўляецца ўлік палажэнняў мадэльных законаў, якія прымаюцца. Ён упэўнены, што гэта будзе спрыяць фарміраванню агульных рынкаў у розных сферах, стварэнню роўных умоў для суб'ектаў гаспадарання і грамадзян Садружнасці. «Калі для гэтага спатрэбіцца пашырэнне пэўных паўнамоцтваў, мною было сказана, што пры адпаведным абгрунтаванні мы будзем зацікаўлены разглядаць гэтыя прапановы і, магчыма, надзяляць інтэграцыйныя органы нейкімі паўнамоцтвамі», — заявіў спікер.

### Жывыя інвестыцыі ў «Вялікі камень»

Падчас сустрэчы з намеснікам старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Чжан Пінам спікер верхняй палаты беларускага парламента заявіў, што плануе наведаць Кітай пасля XIX з'езда Камуністычнай партыі гэтай краіны. Да візіту Міхаіла Мясніковіча ў КНР XIX з'езд Камуністычнай партыі скончыць сваю работу, у сувязі з чым можна будзе весці дыялог на прынцыпова новай платформе, якую выпрацуюць удзельнікі гэтага з'езда. Акрамя таго, беларускі бок прапануе па выніках візіту беларускага парламентарыя падпісаць сумеснае камюніке, праект якога ўжо накіраваны ва Усекітайскі сход народных прадстаўнікоў для ўзгаднення. Плануецца таксама падпісанне адпаведнага пагаднення на ўзроўні парламенцкіх груп дружбы.

Падчас сустрэчы Міхаіл Мясніковіч выказаў думку, што Беларусь зацікаўлена ў прамых замежных інвестыцыях. «У нас знаходзіцца ў рабоце вялікі праект Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка пад назвай «Вялікі камень». Чаканні ад гэтага праекта вельмі вялікія, і мы разлічваем на больш актыўную інвестыцыйную дзейнасць кітайскіх кампаній», — падкрэсліў ён.

### Праз Беларусь — на рынак ЕАЭС

Тэма інвестыцый была закранута і падчас перагавораў са старшынёй Народнай скупшчыны (парламента) Сербіі Маяй Гайковіч. У цэлым, на думку Міхаіла Мясніковіча, беларуска-сербскія адносіны выбудоўваюцца эфектыўна, у тым ліку дзякуючы ўплыву Сербіі ў Еўропе.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнуў увагу на магчымасці, якія адкрываюцца для Сербіі як беларускага партнёра ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза. «Беларусь з'яўляецца актыўным членам ЕАЭС, куды таксама ўваходзяць Расія, Казахстан, Арменія і Кыргызстан, у нас агульны рынак, практычна без выключэнняў і абмежаванняў, і, калі сербскі бізнес прысутнічае на беларускім рынку, можна лічыць, што ён прысутнічае і на рынку іншых краін інтэграцыйнага аб'яднання», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

### І нафта, і газ, і сельская гаспадарка

А егіпецкі бок прапанаваў нашай краіне прыняць удзел у рэалізацыі буйных нафтагазавых праектаў у Чырвоным і Міжземным морах. Пра гэта заявіў старшыня парламента Егіпта Алі Абдэль Аль на сустрэчы з Міхаілам Мясніковічам. Беларускі бок мог бы прыняць удзел у ажыццяўленні праекта новай сталіцы Егіпта. «І мы зацікаўлены ў супрацоўніцтве па рэалізацыі ўсяго цыкла праектаў, звязаных з сельскай гаспадаркай, у тым ліку будаўніцтва элеватараў і заводаў па вытворчасці, апрацоўцы і ўпакоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў», — запэўніў Алі Абдэль Аль. Яшчэ адзін перспектыўны напрамак супрацоўніцтва — інвестыцыі, якія накіроўваюць беларускія кампаніі і бізнесмены ў эканоміку Егіпта, а таксама работа ў межах супрацоўніцтва з ЕАЭС.

Міхаіл Мясніковіч запэўніў старшыню парламента, што Беларусь надае вялікае значэнне развіццю адносін з Егіптам. Пры гэтым ён акцэнтаваў увагу на важнасці адкрыцця ў Мінску егіпецкага пасольства, бо гэта «спрыяла б стварэнню адпаведнай дыпламатычнай інфраструктуры для нарошчвання супрацоўніцтва».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

# ПОРУЧ З ІНФАРМАЦЫЙНЫМІ ТЭХНАЛОГІЯМІ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)**

— Гэта сістэма дазваляе кантраляваць усё, што адбываецца ў вашай кватэры або офісе, — расказаў **начальнік па рабоце з ключавымі кліентамі Магілёўскага філіяла «Белтэлекам» Уладзімір ЦОЙ.** — Яна прадстаўляе сабой кантролер і тры датчыкі — адкрыцця дзвярэй, дыму, руху. Падключаецца яе да інтэрнэту і ўсталёўваецца на сваім тэлефоне праграму. З яе дапамогай кантралюеце ўсё, што адбываецца ў кватэры. Калі вашы дзверы адчыніліся ці там нешта задымілася, сістэма адразу ж вам паведаміць на мабільны або камп'ютар. Акрамя гэтага, можна дабавіць іншыя датчыкі і атрымаць дадатковыя паслугі.

Наогул, рынак тэлекамунікацыйных паслуг у Магілёўскай вобласці развіваецца ў адпаведнасці з галоўнымі мерапрыемствамі дзяржпраграмы. Ідзе планамернае падключэнне юрыдычных асоб, дзяржаўных арганізацый і ўстаноў да адзінай інфармацыйна-тэлекамунікацыйнай інфраструктуры краіны. Дырэктар Магілёўскага філіяла прадпрыемства «Белтэлекам» Валерый Барысавец падкрэсліў, што будаўніцтва оптавалаконных ліній з прымяненнем тэхналогіі GPON дазваляе аказваць шэраг якасных тэлекамунікацыйных паслуг і сэрвісаў, у тым ліку па адукацыі, ахове здароўя.

**Віталь ІГНАТОВІЧ, начальнік кіраўніцтва спраў Магілёўскага аблвыканкама**, падрабязна азнаёміў прысутных з тэмпамі інфарматызацыі ў розных сферах дзейнасці. Каля двух дзясяткаў устаноў адукацыі Магілёва, Шклоўскага і Клімавіцкага раёнаў ужо працуюць з сэрвісам «Электронны дзённік/электронны журнал». У стадыі далучэння знаходзяцца школы Бабруйска, Бялыніцкага, Быхаўскага, Крычаўскага, Клічаўскага, Мсціслаўскага, Асіповіцкага раёнаў.

У магілёўскай школе №45 рэалізаваны праект «Карта навучэнца», які дае магчымасць школьніку выкарыстоўваць электронны дакумент у якасці пропуска ў школу, білета чытача і можа нават замяніць праязны ў грамадскім транспарце. Трэба толькі, каб гарсавет дэпутатаў Магілёва прыняў адпаведнае рашэнне.

Актыўна далучаюцца да інфармацыйных тэхналогій установы аховы здароўя. Да пілотнай зоны функцыянавання аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы абароту электронных рэцэптаў падключаны ўсе паліклінікі Магілёва, абласны лячэбна-дыягнастычны цэнтр, Бабруйская гарадская паліклініка №3. На 9 кастрычніка ў Магілёве было выдадзена 33,5 тысячы электронных картаў і выпісана 46 тысяч электронных рэцэптаў. У Бабруйску адпаведна 10 і 18 тысяч. На адрас Міністэрства аховы здароўя накіраваны ліст з просьбай разгледзець магчымасць далучыць да пілотнай зоны яшчэ некалькі арганізацый вобласці, дзе створаны неабходныя тэхнічныя ўмовы.

Інфармацыйная прастора органаў мясцовага кіравання і самакіравання Магілёўскай вобласці прадстаўляе сабой карпарацыйную інфармацыйную сетку, дзе ўзаемадзейнічаюць 22 падраздзяленні аблвыканкама і дзяржарганізацый, два гарвыканкамы, адміністрацыі раёнаў Магілёва і Бабруйска і 21 райвыканкам, да якіх падключаны 179 мясцовых Саветаў дэпутатаў, у тым ліку 155 сельскіх Саветаў дэпутатаў.

Для больш эфектыўнага выкарыстання народнымі абраннікамі інфармацыйных тэхналогій у рабоце з грамадзянамі Магілёўскі абласны Савет дэпутатаў рэкамендаваў гарадскім і раённым выканаўчым камітэтам як мага часцей размяшчаць на сайтах інфармацыю аб дзейнасці дэпутатаў базавага і пярвічнага ўзроўняў, удасканаліць стылістыку сайтаў для зручнасці навігацыі карыстальнікаў з абмежаванымі магчымасцямі, прадугледзець распрацоўку мабільнай версіі сайтаў. Слушныя парады былі дадзены ўсім, ад каго залежыць развіццё інфармацыйна-тэлекамунікацыйнай інфраструктуры вобласці.

Усяго на сесіі было разгледжана 17 пытанняў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

ПАЖАРНАЯ БЯСПЕКА

# Апавяшчальнік для ветэрана і дровы для шматдзетнай сям'і

## Рэйды супрацоўнікаў сацыяльнай службы, інспектараў МНС і прадстаўнікоў сельвыканкамаў нярэдка выяўляюць праблемы

**У Брэсцкім раёне зараз 720 чалавек пажылога ўзросту адносяцца да катэгорыі адзінокіх грамадзян, і дзве з паловай тысячы пенсіянераў пражываюць адны. Іх дамы і кватэры становяцца часцей за ўсё адрасамі наведвання для раённых камісій, у якія ўваходзяць службовыя асобы з названых вышэй структур. Загадчыца аддзялення тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва раёна Тамара Нядзельская сёлета ўжо паўдзельнічала ў рэйдах па вёсках некалькіх сельсаветаў. Тамара Іосіфаўна гаворыць, што ў гэтым годзе выяўлена менш парушэнняў пры эксплуатацыі печаў пажылымі людзьмі, чым летась. Напрыклад, у населеных пунктах Знаменскага і Лышчыцкага сельсаветаў наконт гэтага амаль не ўзнікла заўваг у спецыялістаў. Значыць, леташнія агрэхі выправілі.**

Дарэчы, двум ветэранам вайны з Матыкальскага сельсавета Васілю Бародзіку і Мікалаю Зданевічу сёлета адрамантавалі печы за кошт дзяржаўнай праграмы, а тром грамадзянам устаноўлены аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі. Гэта да пытання эфектыўнасці рэйдаў. Менавіта падчас наведванняў камісій былі выяўлены непаладкі ў печах альбо адсутнасць апавяшчальных прыбораў, і вось пытанне вырашане. А налета павінна стаць яшчэ лепш, таму што ў дзяржаўную праграму падтрымкі ўключаны і адзінокія пажылыя людзі. Калі раней печы за кошт бюджэту рамантавалі толькі ветэранам вайны, асобным катэгорыям інвалідаў, цяпер з'явілася магчымасць дапамагаць адзінокім маламаёмным людзям, падкрэсліла Тамара Нядзельская.

Вераніка Лаўранюк, інспектар Брэсцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, расказала, што аддзел не толькі праводзіць праверкі па месцы пражывання старых людзей, але і арганізоўвае самыя розныя акцыі. Так, сёлета ў госці да ветэрана вайны Пятра Паўлавіча Мігуцкага інспектары супрацьпажарнага нагляду завіталі разам са старшакласнікамі Мухавецкай сярэдняй школы. Пётр Паўлавіч разам з жонкай Антанінай Паўлаўнай расказалі моладзі пра цяжкія гады вайны. А вучні з задавальненнем дапамаглі ветэранам навесці парадак на двары і прысядзібным участку. Работнікі РАНС у якасці падарунка ўстанавілі пажылым людзям пажарны апавяшчальнік. Такім чынам, атрымалася не толькі мерапрыемства асветніцкага характару для моладзі, бо хлопцам і дзяўчатам паказалі, як трэба клапаціцца пра пажарную бяспеку дзядуль і бабуль, але і знакам увагі для шаноўных ветэранаў.

Інспектары райаддзела МНС расказалі пра тыповыя парушэнні правілаў пажарнай бяспекі, якія даводзіцца выяўляць. Аказваецца, і «жучкі» ў лічыльніках электраэнергіі — гэта не такая ўжо рэдкасць у XXI стагоддзі, як можа падацца на першы погляд. Часта бывае, што пажылыя людзі адхрышчваюцца: маўляў, не ведаю, адкуль узялося, ніколі не лазіў у лічыльнік. А давесці людзям, што гаспадар домаўладання нясе адказнасць за стан прыбораў, устаноўленых у доме, бывае вельмі няпроста. У такіх выпадках інфармацыя паведамляецца ва ўстанову электразабеспячэння.

Прадметам асаблівай увагі становяцца праблемныя сем'і альбо адзінокія людзі, якія злоўжываюць алкаголем, вядуць асацыяльны лад жыцця. У адным з такіх дамоў апавяшчальнік быў устаноўлены даўно, але аказаўся няспраўным. Там былі перарэзаныя правадкі. Відаць, прыбор рэагаваў на цыгарэтны дым і тым самым раздражняў гаспадароў дома альбо іх гасцей. Вось і прывялі яго ў непрыгоднасць, хоць гаспадар і бажыўся, што не чапаў апавяшчальніка. Паколькі заўсёднікамі яго дома бываюць усе мясцовыя выпівакі, то зусім магчыма, што ідэя забяспечыць цішыню прыйшла ў галаву некаму з іх. І што зробіш у такой сітуацыі? Пакінуць чарговае прадпісанне, давесці інфармацыю да ўчастковага. Гэта, вядома, будзе зроблена.

Старшыня Тамашоўскага сельскага Савета Алена Бурак звярнула ўвагу на яшчэ адну сацыяльную праблему апошняга часу — алкагольную залежнасць пажылых вясковых жанчын. На жаль, ва ўсіх рэгіёнах цяпер адзначаюць, што ў вёсках ёсць адзінокія бабулькі, якія прапіваюць пенсію з усімі сацыяльнымі наступствамі. Адна такая стала сапраўдным галаўным болем кіраўніцтва названага сельвыканкама. Летась яе накіравалі на сацыяльны ложак. Зіму пенсіянерка прабыла ў бальніцы сястрынскага догляду, на лета вярнулася дадому. І апошнія праверкі выявілі, што жыллё яе патэнцыйна небяспечнае. Давядзецца зноў вырашаць пытанне з сацыяльным ложкам. Яшчэ аднаго жыхара вёскі, мужчыну, накіравалі на зіму ў лячэбна-працоўны прафілакторый. І гэта гарантыя, што за зіму ён не згарыць разам з домам.


Удзельнікі рэйдавай брыгады Брэсцкага раёна наведваюць домаўладанні.

Алена Іванаўна расказала, што падчас сумесных рэйдаў выяўлена немала праблем, большасць з якіх вырашаюцца ў рабочым парадку. Правяралі пажарную бяспеку шматдзетнай сям'і і высветлілі, што людзі не запасліся на зіму палівам. Усёй грамадой аператыўна вырашалі пытанне, нават дырэктар Прыбараўскай школы, дэпутат сельскага Савета, падключыўся. І дровы для вялікай сям'і даставілі на падворак. Будзе цёпла ў хаце, значыць, не ўзнікне спакуса ўключаць абагравальнікі, тым больш сумнеўнай якасці.

* * *

Каб яшчэ раз прыцягнуць увагу грамадскасці да пажарнай бяспекі, у краіне распачалі акцыю «За бяспеку разам!». Менавіта з пачаткам ацяпляльнага сезона ўзрастае колькасць пажараў у жылым сектары. Таму інспектары супрацьпажарнага нагляду разам з прадстаўнікамі іншых службаў зноў наведваюць сем'і з званых груп рызыкі, каб напомніць ім аб правілах паводзін. Бяспечных.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

*Брэсцкі раён.*

ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

# ЧЫЯ ТЫ, НІЧЫЙНАЯ СЯДЗІБА?

## Як у Валожынскім раёне рашаюць праблему струхлелых вясковых хат

**Задачу па зносе старых і пустуючых дамоў кіраўнік дзяржавы дакументальна паставіў перад рэгіёнамі некалькі гадоў таму, падпісаўшы Указ №100. Паводле гэтага дакумента, будынкі, прызнаныя непрыдатнымі да далейшага выкарыстання, падлягаюць зносу, а зямля пасля рэкультывацыі ўводзіцца ў севазварот сельгасарганізацый. У Мінскай вобласці гэтая работа вядзецца паслядоўна і пастаянна. У населеных пунктах усё менш застаецца непрывабных, паўразбураных хацін, а на зямельных участках, дзе буяла пустазелле, зеленяюць збожжавыя і іншыя патрэбныя культуры.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З аднаго боку, знос непрыдатнага жылля паляпшае знешні выгляд вёсак. З іншага — стварае бяспеку для жыхароў. Не сакрэт, што струхлелыя збудаванні надта прыцягваюць дзяцей, якія лазяць на гарышчы, у сутарэнні старых пабудоў, падвяргаючы сваё жыццё рызыцы.

— Менавіта таму мы імкнёмся не толькі весці ўлік такога жылля, але і дзейнічаем. У 2015 годзе планавалася знесці 40 дамоў, знеслі — 47. У 2016 — 45 замест 38. Сёлета «пазбавіліся» ад 53 дамоў пры плане 50. Стараемся, так бы мовіць, ісці з апярэджаннем. Гэта дазволіла ў грамадскі севазварот уключыць дзясяткі гектараў зямлі,— расказаў **старшыня Валожынскага раённага Савета дэпутатаў Сяргей ГЛІНСКІ.**

— А ці не было выпадкаў, калі пасля зносу струхлелага жылля аб'яўляліся спадчыннікі са сваімі прэтэнзіямі? — пацікавілася ў Сяргея Францавіча.

— Такі выпадак быў пяць гадоў таму. Няправільна былі аформлены дакументы пры зносе, таму па рашэнні суда давялося з бюджэту кампенсаваць уласніку страты — каля 25 млн «старых» рублёў. Хоць, зрэшты, дом нагадваў хутчэй хлеўчык — адны сцены, — працягвае Сяргей Глінскі. Цяпер усе неабходныя «паперы» ўважліва рыхтуюцца і правяраюцца на адпаведнасць заканадаўству. Калі ў дома няма ўласнікаў, то мы шукаем магчымых спадчыннікаў. І толькі пасля таго, як не ўдаецца іх знайсці або высветліцца, што яны адсутнічаюць, звяртаемся ў суд для прызнання сядзібы безгаспадарнай. Па рашэнні судовай інстанцыі яна пераходзіць ва ўласнасць сельсавета. І тады прымаецца рашэнне знесці дом, а ўчастак выставіць на аўкцыён.

Што датычыцца непасрэдна куплі дыхтоўных дамоў, гаспадары якіх памерлі, а дзеці адмовіліся ад спадчыны, то ў Валожынскім раёне такога вопыту няма. Але і тут, як сведчаць калегі з іншых раёнаў, ёсць пытанне. Дом трэба пераводзіць у разрад нежылога памяшкання або прадаваць з аўкцыёна. Перш яго павінна абследаваць камісія, а суд павінен прызнаць пабудову безгаспадарнай, тады яна пераходзіць ва ўласнасць сельсавета і ён мае права ёй распарадзіцца.

**Дом трэба пераводзіць у нежылое памяшканне або прадаваць з аўкцыёна. Перш яго павінна абследаваць камісія, а суд прызнаць пабудову безгаспадарнай, тады яна пераходзіць ва ўласнасць сельсавета і ён мае права ёй распарадзіцца.**

Уласнік і сам можа даць пісьмовую згоду на знос. Калі ж згоды спадчынніка няма, а дом прызнаны непрыдатным для пражывання, то ён ідзе ў камунальную ўласнасць у судовым парадку. Пры гэтым робіцца папярэдняя ацэнка і вяртанне ўласніку фактычнага кошту дома за вылікам панесеных расходаў.

У раённым бюджэце прадугледжаны сродкі для зносу старых і струхлелых дамоў. Вядома, гэта — дарагая працэдура. З улікам усіх гаспадарчых пабудоў, выкарчоўвання садовых дрэў і кустоў, рэкультывацыі ўчастка. Звычайна работамі займаецца сельгасарганізацыя, на тэрыторыі якой знаходзіцца населены пункт. Гаспадарка, як правіла, мае сваю тэхніку, рабочую сілу. Гэта дае магчымасць патанніць працэс. Будаўнічыя матэрыялы забірае для сваіх патрэб: драўніну — на дровы, камяні, шчэбень — на ўладкаванне дарогі.

Хоць, як паказвае практыка, старыя дамы пры разборцы ствараюць праблемы: перашкаджаюць рабоце шматлікія цвікі, дрот, заўважыў мой суразмоўнік.

Як сцвярджаюць спецыялісты, ідэальны варыянт пры зносе дома — перапрацоўка матэрыялаў на драбільнай устаноўцы. Але такіх машын у краіне — адзінкі. З другога боку, застаюцца элементы, якія таксама патрабуюць сродкаў на ўтылізацыю. Для раёнаў, вобласці гэта страта. Тым не менш упарадкаванне на зямлі не спыняецца.

Што датычыцца вызвалення ўчасткаў, то не заўсёды магчыма ўвесці іх у грамадскі севазварот: далёка ад калгаснага поля. Тады іх забіраюць суседзі.

— Нядаўна знеслі тры пабудовы ў аграгарадку Сакаўшчына. Зямельныя надзелы ўзялі людзі для садаводства і агародніцтва, — кажа Сяргей Глінскі. — У наступным годзе таксама плануем знесці 50 дамоў. Але пазбаўляемся адных — з'яўляюцца іншыя. Вёска старэе, людзі паміраюць, спадчыннікі, як правіла, раз'ехаліся па гарадах. Таму гэты працэс няспынны.

Ды парадак на зямлі, нягледзячы на цяжкасці, павінен захоўвацца, лічыць старшыня раённага Савета дэпутатаў. У наступным годзе, у прыватнасці, у раёне мяркуюць знесці яшчэ 50 дамоў. Удасткі карыстаюцца найбольшым попытам у аўкцыённай зоне: у Ракаўскім, Пяршайскім, Дорскім сельсаветах і Івянецкім пассавеце. Гэтыя тэрытарыяльна-адміністрацыйныя адзінкі знаходзяцца бліжэй да Мінска. Што датычыцца іншых сельсаветаў, то асаблівага ажыятажу вакол надзелаў не назіраецца. Справа ў тым, што тут яшчэ з часоў панскай Польшчы была распаўсюджана хутарская сістэма. Спадчыннікі выкарыстоўваюць сядзібы сваіх бацькоў найбольш пад дачы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

МЕРКАВАННІ

## Ці задавальняе вас гандаль у вёсках, і што неабходна палепшыць?

**Тэма гандлю ў малых населеных пунктах даволі далікатная — дзесьці не хапае тавараў, дзесьці скардзяцца на цэны, а дзесьці стацыянарных крам няма наогул. Мы звярнуліся да людзей, якія займаюцца гэтым кірункам, каб высветліць, як выглядае сітуацыя на самай справе і над чым сапраўды трэба папрацаваць.**

**Намеснік старшыні Касцюковіцкага раённага выканаўчага камітэта па пытаннях эканомікі Любоў КІСЯЛЁВА:**

— У нас гандаль з другой паловы года пачаў працаваць нашмат лепш, аб'екты перагледзелі свае падыходы. Чаму? Таму што яны рыхтуюцца да таго, што да нас у раён прыйдзе буйная гандлёвая сетка. Ці вытрымаюць яна прыватнікаў? Вядома, нейкае пераразмеркаванне патокаў адбудзецца. Але частка насельніцтва, якая выязджала па пакупкі як у іншыя раёны краіны, так і ў Расію, з-за пашырэння асартыменту, напэўна, стане рабіць іх тут. Я думаю, што дзякуючы гэтаму павялічыцца таксама і таваразварот. Быў час, калі мясцовыя жыхары вярталіся дадому з камандзіровак толькі праз крамы, размешчаныя ў іншых раёнах. І цяпер сапраўды падцягнулася харчовая група. Канкурэнцыя — гэта вельмі добра, як мне здаецца. І добра гэта ў першую чаргу для пакупнікоў. Таму што кожная крама пачынае неяк прыцягваць кліента, рабіць зніжкі, арганізоўваць кірмашы.

**Старшыня Сідаровіцкага сельскага выканаўчага камітэта Магілёўскага раёна Алена ПШАНІЧНАЯ:**

— У населеных пунктах сельсавета гандаль нас цалкам задавальняе. Як найлепшую форму магу адзначыць аўтакрамы. Мне падабаецца разнастайны асартымент, хоць звычайна да іх ставяцца з недаверам — думаюць, напрыклад, што тавар пратэрмінаваны, — аднак гэта не так. Аўтакрама — тое месца, дзе тавар можа мяняцца нават часцей, чым у стацыянарных. Палепшыць хочацца будаўнічы напрамак — гэта продаж цэменту, шыферу і падобных рэчаў. Але і тут нашы прадаўцы знаходзяць выхад са становішча: напрыклад, у аўторак прымаюць заказ на тавар, якога ў гэты момант няма ў наяўнасці, а ўжо ў пятніцу дастаўляюць дадому. Такім чынам і крама не завальваецца, і кліент задаволены. Вось мэбля, напрыклад: ёсць каталогі, людзі выбіраюць і заказваюць. У мінулым годзе ўсе заказвалі газавыя пліты, пакольці аказалася, што яны павінны быць не старэйшыя за дзесяць гадоў. Акрамя гэтага, на нашай тэрыторыі ёсць дзве крамы мясцовага агракамбіната — там прадаюцца сала, мяса, каўбасы. Звычайна ёсць па 4—5 найменняў розных каўбас, мне здаецца, што гэтага хапае.

**Старшыня Самахвалавіцкага сельскага выканаўчага камітэта Мінскага раёна Уладзімір ЛОКУН:**

— У нас толькі ў двух вёсках з дванаццаці ёсць стацыянарныя гандлёвыя аб'екты — у Самахвалавічах, дзе мноства такіх пунктаў, і ў вёсцы Цімошкі адна крама. У астатніх — гэта толькі выязны гандаль Мінскага райпо. Мы плануем яшчэ ў двух вёсках падрыхтаваць участкі пад аўкцыён, каб на іх прыватныя арганізацыі пабудавалі дадатковыя пункты. Што да іншых вёсак, то там жыве не так шмат людзей, таму выезду аўтакрамы раз на тыдзень цалкам хапае. Прынамсі, ніхто не скардзіўся. Калі ж нехта напіша зварот, то мы абавязкова разгледзім гэтае пытанне. Што датычыцца асартыменту, то пра гэта можна меркаваць па заўвагах насельніцтва, але да нас ніхто не звяртаўся. Раней такія выпадкі былі. Дарэчы, у райпо ўлічваюць пажаданні насельніцтва, пытаюцца, што прывозіць, а што не. Адзіная праблема ў нас цяпер: у адной краме мы хочам падоўжыць час працы, пакольці цяпер яна функцыянуе да трох гадзін дня. Для гэтага мы шукаем прадаўца, які будзе гатовы працаваць у іншым рэжыме работы.

**Прэс-сакратар Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў Таццяна ЛЯШКЕВІЧ:**

— Гандаль, які забяспечвае наша арганізацыя, нас задавальняе. Мы стараемся ўлічваць усе інтарэсы: пакуль у вёсцы застанецца хоць адзін жыхар, стацыянарныя пункты і аўтакрамы будуць яго абслугоўваць. Што хацелася б палепшыць? Арганізацыя не стаіць на месцы — мы закупляем новыя аўталаўкі, пашыраем асартымент, прыслухоўваемся да пажаданняў пакупнікоў. Дарэчы, яны з цягам часу становяцца ўсё больш патрабавальнымі. Акрамя таго, мы ўстанаўліваем аплатныя тэрміналы, закупляем новае абсталяванне. Хацелася б, каб былі створаны роўныя ўмовы для гандлю. Напрыклад, прыватнікі выбіраюць для продажу тое, што выгадна ім, а мы нясём пэўную сацыяльную нагрузку. Але падкрэслю, што мы не скардзімся. У аўтакраме ёсць зацверджаны асартымент, але можна пакінуць заяўку на розныя тавары. Напрыклад, бабуля можа захацець кавун — і наступны раз яго прывязуць. Хтосьці заказвае не толькі харчовыя тавары, але і такія рэчы, як мех цэменту. Мы заўсёды адказваем на просьбы нашых кліентаў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** lukashevich@zviazda.by

# ПОЎНЫ АСАРТЫМЕНТ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Годная аддача

Кіраўнік дзяржавы заўсёды асабліва ставіўся да вёскі. Відаць, у многім таму, што сам нарадзіўся і вырас там. Абавязковая падтрымка сельскіх населеных пунктаў, не проста павышэнне ўзроўню жыцця на вёсцы — а паднясце яго да ўзроўню гарадскога, і ніяк не менш — гэта тэзісы, якія Аляксандр Лукашэнка агучваў на апошніх рабочых сустрэчах, прысвечаных гэтай тэме.

Калі коратка, то пасыл наступны: вяскоўцы робяць велізарны ўнёсак у развіццё эканомікі дзяржавы, гарантаванне яе харчовай бяспекі. Але самі аказваюцца ў менш выгадным, у параўнанні з гараджанамі, становішчы ў плане зручнасці набыцця пэўных тавараў — нават харчовых. У некаторых вёсках можа нават не быць магазіна, і жыхары або задавольваюцца аўтакрамай, якая не заўсёды мае належны асартымент, або вымушаны ехаць у суседнюю вёску ці нават горад, што таксама не вельмі зручна, дый не ўсе, асабліва пажылыя, нават пры жаданні, могуць гэта рабіць. У іншых сельскіх населеных пунктах крамы ёсць, але тая ж праблема — абмежаваны асартымент.

Настаў час змяніць гэтую сітуацыю. Патрэбы людзей павінны быць задаволеныя — без залежнасці ад таго, дзе і хто пражывае. Ні ў якім разе — і ў тым ліку гэта пазіцыя Прэзідэнта — гэта не азначае закрыццё або замену белкаапсаюзаўскага гандлю. У любым выпадку гэта, можна сказаць, унікальная сістэма, якая сваімі пунктамі — як стацыянарнымі, так і мабільнымі — ахоплівае ўсё сельскае насельніцтва краіны — без хлеба, што называецца, людзі не сядзяць. У той жа час усё патрабуе ўдасканалення. У нашым выпадку ім паслужыць як развіццё прыватнай ініцыятывы ў сельскай мясцовасці, так і стварэнне новых гандлёвых сетак, што павінны забяспечыць вяскоўцаў шырокім асартыментам тавараў.

## Стаўка на самазанятасць...

Апошнія месяцы прайшлі пад эгідай абмеркавання — на ўзроўні Прэзідэнта — пакета дакументаў па развіцці прадпрымальніцтва і стымуляванні дзелавой актыўнасці. Сярод іншага абмяркоўвалі праект указа Прэзідэнта «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання», які, дарэчы, ужо падпісаны. Праект указа накіраваны на развіццё гандлю, грамадскага харчавання, бытавых паслуг у першую чаргу ў сельскай мясцовасці і малых гарадах.

Напрыклад, індывідуальныя прадпрымальнікі і юрыдычныя асобы, што здзяйсняюць штучны гандаль у сельскай мясцовасці, будуць вызвалены ад падатку на дабаўленую вартасць. Акрамя гэтага, дакумент прадугледжвае магчымасць ўстанаўлення на асобных тэрыторыях спецыяльнага рэжыму падаткаабкладання ў сферы гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання — з выплатай падатку на прыбытак для прадпрыемстваў у памеры 6% і адзінага падатку для індывідуальных прадпрымальнікаў у памеры адной базавай велічыні. Прапісаны і іншыя спрашчэнні ўмоў для ажыццяўлення названых відаў дзейнасці — напрыклад вызваленне ад падатку на нерухомасць.

А сітуацыя там сапраўды не вельмі пазітыўная. Прынамсі, калі адштурхоўвацца ад статыстыкі. Так, на працягу апошніх гадоў назіраецца скарачэнне колькасці магазінаў у сельскіх населеных пунктах. Толькі з 2012 па 2015 гады яна зменшылася на 10% — з 9893 да 8977 адзінак. У выніку там, дзе некалькі гадоў таму былі крамы або іншыя аб'екты бытавога абслугоўвання, якія працавалі, засталіся пустыя будынкі. Для выпраўлення сітуацыі праектам дакумента абласныя Саветы дэпутатаў на пяць гадоў — з 1 студзеня 2018-га па 1 студзеня 2022 года — надзяляюцца правам на назначэнне шэрагу падатковых і іншых ільгот суб'ектам гаспадарання, што здзяйсняюць названыя віды дзейнасці на тэрыторыі сельскай мясцовасці і ў малых гарадах.

Такім чынам, названы дакумент павінен паспрыяць развіццю гандлю на вёсцы, стварэнню там канкурэнтаздольнага ў гэтым плане асяроддзя, што адлюструецца на якасці тавараў і паслуг. Акрамя гэтага — не менш важная функцыя ўказа, — самазанятасць сельскага насельніцтва. Бо менавіта ў вёсцы людзям найбольш складана знайсці працу.

## ... і буйны бізнес

Калі казаць пра канкурэнцыю ў сістэме вясковага гандлю, то акрамя індывідуальных прадпрымальнікаў, невялікіх прыватных кампаній, яе могуць скласці і буйныя гандлёвыя сеткі, вядомыя па ўсёй краіне. У пачатку верасня Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з бізнесменам Паўлам Тапузідзісам праект апошняга па абслугоўванні сельскага насельніцтва.

Кампанія бізнесмена ўжо распачала будаўніцтва ўнікальнага комплексу ў Шклове. Праект прадугледжвае будаўніцтва супермаркета з гандлёвай залай плошчай звыш 700 квадратных метраў, аптэкай, разліково-касавым цэнтрам, зонай гандлю прамысловымі таварамі. Акрамя гэтага, плануецца пабудаваць там жа два кінатэатры на 70 месцаў кожны, забаўляльны цэнтр і кавярню.

Гэты комплекс плануецца эксплуатаваць як размеркавальны цэнтр для забеспячэння гандлёвых аб'ектаў у Шклоўскім раёне і для выканання заказаў пакупнікоў з населеных пунктаў, дзе няма гандлёвых аб'ектаў. У перспектыве таварамі будзе забяспечваца не менш за 15 населеных пунктаў Шклоўскага раёна.

Праект плануецца выкарыстоўваць як тыповы і ў іншых рэгіёнах дзяржавы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** yushkevich@zviazda.by

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

# БУЛКА ХЛЕБА ДЛЯ БАБУЛІ

## Чаму прыватнікі не прадаюць харчовыя тавары?

**Сёння галоўным гарантам сацыяльных стандартаў па харчаванні выступае Белкаапсаюз. Ён адзіны забяспечвае аддаленыя населеныя пункты таварамі першай неабходнасці ва ўсіх рэгіёнах краіны. Так, у Пінскім раёне шэсць аўтакрам абслугоўваюць 77 вёсак. Канкурэнтам яму мог бы стаць адзін з буйных рытэйлераў, які таксама запусціў праект па ахопе перасоўным гандлем вясковых населеных пунктаў. Пра плюсы і мінусы такой канкурэнцыі мы пагаварылі з галоўным спецыялістам аддзела эканомікі Пінскага райвыканкама Таццянай ПІСКУН.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— На сёння ў раёне абсалютная большасць прадуктовых крам належыць Пінскаму райпо: 129 з 198, — канстатуе суразмоўнік. — Зарэгістравана толькі 19 прыватных уладальнікаў, у некаторых з іх адкрыта некалькі гандлёвых пунктаў. Але адзіная прыватная крама, дзе прадаюцца харчовыя тавары, якая адкрылася ў апошнія два гады, — гэта крама буйной гандлёвай сеткі «Еўраопт».

Чаму? Адказы могуць быць розныя. Напрыклад, для малога бізнесу непрадуктовую краму адкрыць лягчэй: тавар не псуецца. Да таго ж, калі ў харчовай краме прадаваць алкаголь, неабходна будзе гэта ўзгадніць з РУУС і ўстанавіць камеры відэаназірання. Падчас нашай размовы з Таццянай Піскун у аддзел эканомікі заходзіў мужчына, які плануе адкрыць шынамантаж і краму з будматэрыяламі і запчасткамі. Такое здараецца не кожны дзень, але мясцовыя жыхары спрабуюць зарабляць менавіта праз продаж непрадуктовых тавараў.

З грамадскім харчаваннем сітуацыя прыкладна такая ж, як з прадуктовымі крамамі. З прыватных прадпрыемстваў — толькі кавярня ў аграгарадку Малоткавічы ды летняе кафэ ў вёсцы Пагост Загародскі. Прыдарожны сэрвіс на запраўках аўтадарогі М10 перайшоў на работу пад заказ. У выніку застаюцца толькі кавярні райпо. Даволі часта на святы яны таксама закрываюцца на спецабслугоўванне, а штодзённы запыт не такі вялікі. Магчыма, тут існуе ніша, каб прыйшоў новы прыватнік, каб зрабіць канкурэнтнае асяроддзе і павысіць якасць абслугоўвання. Але разам з якасцю падрастуць і цэны, па якіх жыхары, магчыма, не згодзяцца плаціць. Таму ніхто з прыватнікаў і не спяшаецца рызыкаваць.

Але можна пайсці ад адваротнага. Што будзе, калі гандлёвыя сеткі прыйдуць у раёны і зоймуцца аддаленымі населенымі пунктамі? Па-першае, ёсць рызыка, што райпо не вытрымае канкурэнцыі. Лагічна, што новыя прыватныя аўтакрамы ці стацыянарныя пункты будуць прапаноўваць асартымент шырэйшы, і тым самым прывабліваць пакупнікоў. Што ў іх, магчыма, атрымаецца, і ў крам райпо пачнуцца сапраўды цяжкія часы. Але пры гэтым пракантраляваць прыватнікаў будзе немагчыма. Гандлёвыя пункты райпо павінны выконваць сацыяльныя стандарты і забяспечваць насельніцтва самым неабходным. У кожнай аўталаўцы знойдзецца малако, мяса, масла і іншыя прадукты з пераліку. І працуюць яны строга па раскладзе. Калі нават здарыцца нешта надзвычайнае — захварэе прадавец ці паламаецца машына, — праблема вырашаецца даволі аператыўна. Зноў жа дзякуючы сацыяльным стандартам гандаль райпо ахоплівае нават хутар, дзе жывуць два чалавекі. У прыватнікаў жа такіх абавязкаў няма. І, як любыя бізнесмены, яны вязуць тавар, зыходзячы з прыбытку. Калі па нейкай прычыне рабіць гэта ў пэўны населены пункт стане непрыбыткова, прыватная крама туды не паедзе. Тым больш нярэдка састарэлыя нешматлікія жыхары нічога, акрамя хлеба, не купляюць.

Для райпо цягнуць за сабой непрыбытковыя крамы таксама не выгадна. У цэлым, згодна са статыстыкай па раёне, працуе спажыўкааперацыя ў плюс, ды і прагноз — на рост. Але за статыстыкай налічваецца дзевяць аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца, — гэта крамы, якія зачыніліся. Некаторыя пункты працуюць толькі да 14 ці 16 гадзін. Знайсці новага прадаўца, калі старыя звольніўся, — таксама праблема: моладзь з вёсак з'язджае, а бабулі і дзядулі, вядома, працаваць ужо не пойдуць. Ды і яшчэ заробак не вельмі, мякка кажучы, вялікі. У аўтакраме таксама не кожны згодзіцца ездзіць у любое надвор'е і гандляваць амаль на вуліцы.

На самай справе ў такой сітуацыі, калі ёсць пэўны запыт з боку насельніцтва датычна разнастайнасці асартыменту і крамаў, у дзяржавы ёсць вопыт, стандарты і неабходнасць іх выконваць, а ў бізнесу — ініцыятыва ва ўсё гэта ўцягнуцца, павінен нарэшце запрацаваць механізм дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Калі на вызначаных умовах пэўныя гандлёвыя сеткі маглі б узяць на сябе абавязкі па забеспячэнні харчам нейкіх населеных пунктаў, разгрузіць райпо так, каб гэта было выгадна абодвум бакам, і працаваць сабе ў прыбытак, выконваючы пры гэтым сацыяльныя стандарты.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*



«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## Як курцу без «Кароны»?

**Са Смалявіч з пытаннем звярнулася чытачка: чаму перыядычна ўзнікае дэфіцыт тытунёвых вырабаў пэўнай маркі?**

— Мой стрыечны брат курыць так званую жоўтую «Карону» — як усе называюць гэтую марку па колеры ўпакоўкі. Гаворыць, што час ад часу яна знікае з продажу. Калі зноў з'яўляецца, ён бярэ на запас адразу блокамі. Перыядычна просіць і мяне прывезці са сталіцы, калі бываю, але і ў Мінску, здараецца, не ў першай сустрэтай краме можна знайсці ўпадабаныя цыгарэты. З чым гэта звязана? — пытаецца чытачка.

Сапраўды, аўтар гэтых радкоў хоць і не прыхільнік названай маркі цыгарэт, але падобныя сітуацыі — і са знікненнем, і з набыццём тытунёвых вырабаў курцамі адразу блокамі — знаёмы, у тым ліку таксама на прыкладзе родных. Ды і ў інтэрнэце, калі паглядзець форумы, відаць, што праблема не новая, яна перыядычна паўтараецца. З пытаннем, чаму «жоўтая» «Карона» раз-пораз становіцца дэфіцытам, мы звярнуліся да вытворцы. Адказ быў даволі просты.

Як расказалі нам спецыялісты, усе цыгарэты падзяляюцца на тры цэнавыя сегменты: нізкі, сярэдні і высокі. Названая «жоўтая» «Карона» адносіцца да першага сегмента і з'яўляецца ў ім найбольш папулярнай. Між іншым, любая вытворчасць тытунёвых вырабаў квацірыецца. Квоты размяркоўваюцца паміж двума вытворцамі ў краіне. Гэта значыць, што прадпрыемства не можа выпусціць больш тытунёвых вырабаў, у тым ліку і першага цэнавага сегмента, чым прадпісвае вызначаная квота. А паколькі, як мы сказалі, «Карона» адносіцца да найбольш папулярных марак цыгарэт у сваім сегменце, перыядычна курцы адчуваюць дэфіцыт свайго «паліва». Можа, тады варта павялічыць квоты, каб больш насыціць рынак патрэбным некаторым спажыўцам таварам? Прадпрыемства такія прапановы робіць, але канчатковае рашэнне залежыць не ад яго.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

ДОБРАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

## Клічаўлян навучаць вермітэхналогіям

**У райцэнтры Магілёўскай вобласці рэалізуецца цікавая ініцыятыва «Вермікантэйнеры ў кожны дом», фінансаванне якога ажыццяўляецца за кошт еўрапейскага гранта ў рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь».**

— У горадзе шмат прыватнага сектара з прысядзібнымі ўчасткамі. Людзі загружаюць кантэйнеры бацвіннем і іншым смеццем расліннага паходжання. Ад гэтага на нашу тэхніку ўскладаецца дадатковая нагрузка, — сведчыць **дырэктар Клічаўскага УКП «Жылкамгас» Андрэй МАЦЮШОНАК.** — Мы хацелі б яе паменшыць і скараціць страты на пагрузку, транспарціроўку і захаванне адходаў. Тым больш што гэтае смецце можна перапрацоўваць на сваіх жа ўчастках з дапамогай каліфарнійскіх чарвякоў — папулярнай на Захадзе вермітэхналогіі.

На грошы міжнароднай дапамогі клічаўская сярэдняя школа №2 (распрацоўшчык праекта) закупіць 167 кантэйнераў, 10 з якіх установіць на сваёй тэрыторыі для правядзення школьных заняткаў і адукацыйных семінараў сярод насельніцтва. Важна, каб як мага больш людзей даведалася, як важна правільна абыходзіцца з цвёрдымі камунальнымі і арганічнымі адходамі і паасобна збіраць другасныя рэсурсы. Усе астатнія 157 кантэйнераў перададуць жыхарам вуліцы Чырвонаармейскай па дагаворах на бязвыплатнай аснове. Як адзначыў Андрэй Мацюшонак, попыт ахвотных паўдзельнічаць у праекце ўжо перавысіў прапанову. На працягу двух гадоў камунальнікі будуць адсочваць, наколькі эфектыўна выкарыстоўваюцца гэтыя скрыні.

Яшчэ адзін партнёр праекта — фермерская гаспадарка «Канстанта арт», якая займаецца развядзеннем каліфарнійскіх чарвякоў, падзеліцца матачным пагалоўем з насельніцтвам.

— Калі кампост у сярэднім спее год, то з гэтымі чарвякамі месяц—два, — з веданнем справы кажа Андрэй Мацюшонак. — Атрымліваецца вельмі выдатны кампост. Людзі хутка адчуюць усе перавагі. А наш горад стане чысцейшым і багацейшым.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# МАНАПОЛІЯ ЦІ КАНКУРЭНЦЫЯ?

## Спажыўцу без розніцы, абы выбар быў

**Амаль паўсюдна ў невялікіх вёсках можна ўбачыць краму, якая не працуе. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці такіх аб'ектаў амаль 300. Прычына ў асноўным адна — насельніцтва вёскі зменшылася, і тавараабарот вельмі малы. Але гэта не значыць, што вяскоўцы павінны выжываць, як хто зможа. Ім на дапамогу прыходзяць крамы на колах. Прычым колькасць мабільных гандляроў, прынамсі на Гродзеншчыне, пастаянна расце.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Сацыяльны работнік Данута АШУРКЕВІЧ у краму да Анжалікі БЫЧКОЎСКАЙ заходзіць па пакупкі для сваіх падапечных штодня.**

### Альтэрнатыўны магазін

Зарачанка — адна з невялічкіх і нават тыповых вёсак на захадзе Гродзенскага раёна. Тут дзейнічае старажытны касцёл, у былым клубе нядаўна адкрылі музей ручніка. Будынак не пустуе — сюды прыязджаюць турысты, каб убачыць сапраўдную беларускую спадчыну. Саміх жыхароў у гэты восеньскі час на вуліцы амаль няма. Васіль Рыгоравіч ідзе ад калодзежа з двума вёдрамі. Пытаюся, дзе вяскоўцы прадукты купляюць. Аказалася, што тут ёсць крама ў канцы вуліцы. Па словах пенсіянера, працуе там вельмі ветлівая жанчына. Вырашыла зайсці, даведацца, як ідзе гандаль. Але не пашанцавала. Крама аказалася на замку, а на акне аб'ява: прадавец захварэла. Васіль Рыгоравіч растлумачыў: не бяда, хутка павінна прыбыць прыватная аўтакрама.

І сапраўды, металічны фургон, трубячы, прамчаўся па вуліцы і вярнуўся назад. Вуліца адразу ажыла. На сігнал выйшлі пакупнікі. Мужчына купляе хлеб, «вітушку», просіць больш танную каўбасу. Жанчыны да абавязковага асартыменту — хлеб, малако — дадаюць нешта салодкае. Хтосьці пернікі купляе, хтосьці цукеркі-труфелі, хтосьці зефір. 10—15 хвілін прыпынку, і аўтакрама пайшла далей. За дзень, паведаміла прадавец, трэба аб'ехаць 15—17 вёсак.

### Руплівы прадпрымальнік

Забяспечваць вяскоўцаў прадуктамі Мадэвуш Бялы ўзяўся 10 гадоў назад. Сам ён па спецыяльнасці інжынер-будаўнік, але вырашыў паспрабаваць сябе ва ўласнай справе. Раённыя ўлады пайшлі насустрач руплівому прадпрымальніку, які надумаў арганізаваць аўтагандаль.

Сёння можна гаварыць аб тым, што прыватная ініцыятыва ў многім стала сапраўдным палачкай-выручалачкай для вяскоўцаў. Кааператыўны гандаль часта не спраўляўся з аб'ездам вёсак, а крамы з-за нізкай выручкі папросту закрываліся. Многія з іх і сёння стаяць занядбанымі і паціху разбураюцца. Бадай што ў кожным раёне набярэцца з дзясятак, а то і 20 такіх будынкаў.

Зразумела, што вяскоўцам была патрэбна альтэрнатыва. Мадэвуш вырашыў ісці ў нагу з часам, набраўся вопыту за мяжой і стаў укладваць сродкі ў развіццё аўтагандлю. Трэба сказаць, што прэферэнцыі бізнесмен атрымаў пры набыцці фургона, абсталяванага халадзільнымі ўстаноўкамі. Зараз у яго тры такія машыны, якія штодзень раз'язджаюць па дарогах раёна. Кожная «накручвае» за выезд да 100 кіламетраў. Дарогі значна палепшыліся, таму амаль ва ўсе месцы можна даехаць у любое надвор'е.

— Нас чакаюць, асабліва на хутарах, — прызнаецца Мадэвуш Бялы, — з жыхарамі наладжана тэлефонная сувязь. Калі мы, напрыклад, не можам прыехаць, тэлефануем старасту вёскі. Але такія сітуацыі бываюць рэдка.

### Кадры вырашаюць многае

Разам са старшынёй Азерскага сельвыканкама Аленай Андрусевіч заходзім у прыдарожную краму спажывецкага таварыства ў вёсцы Стрыеўка. Гэты гандлёвы пункт з ліку выгадных для кааператараў, бо знаходзіцца ў бойкім месцы. Але арганізацыя гандлю вымушае жадаць лепшага. Прадавец Алена Яжэеўна паказвае тэрмометр — тут, як і на дварэ, дзесяць градусаў цяпла. Кажа, што ацяпленне ўключаюць у канцы лістапада. Мабыць, цяжка знайсці ахвотных працаваць у такіх умовах, бо на дзвярах вісіць аб'ява, што на працу патрэбны прадавец і яшчэ тры чалавекі — у бліжні аграгарадок. Жанчына прызнаецца, што раней працавалі ўтрох, але дзве пайшлі з-за нізкай зарплаты. Алена стараецца нарошчваць абарот, пастаянна праводзіць акцыі, але прыватны гандаль усё ж паціху, але выцясняе кааператараў.

Гаспадыня прыватнай крамы хоць і працуе на самым ускрайку вёскі, але станам работы задаволена — яе пункт не пустуе. Бацькоўскую справу працягвае некалькі гадоў і адчувае сябе на сваім месцы. Кажа, што ветлівы настрой людзі вельмі добра адчуваюць. І сапраўды, Анжаліка з увагай ставіцца да пакупнікоў і нават перарвала размову з намі, каб абслужыць кліента. Маленькая крама з багатым асартыментам пакінула добрае ўражанне, і сюды захацелася прыйсці зноў.

Некалі манапольная кааперацыя адчувае значную канкурэнцыю. І не толькі з боку прыватных гандляроў, але і ад вядомых гандлёвых сетак. Іх аўтакрамы праціскваюцца ў нішу, якая ўзнікла пасля закрыцця гандлёвых пунктаў на вёсках. Гэта прызнаюць і прадстаўнікі абласнога спажывецкага таварыства. Хоць і запэўнілі, што кадравае пытанне не стаіць востра і прадаўцоў на вёсцы хапае.

### Аўтакрама — добра, але крама — лепш

Так лічаць жыхары вёскі Лакна, дзе зусім нядаўна ўзнавіў работу стацыянарны гандлёвы пункт каапсаюза. Сітуацыя няпростая. Крама хоць і запрацавала, але выручка тут мізэрная, бо вяскоўцы аддаюць перавагу аўтакраме буйнога рытэйлера. З такім падыходам спажывецкае таварыства наўрад ці пагодзіцца, і пункт зноў можа спыніць сваю дзейнасць. Тым больш што працуе ён нерэгулярна. Падчас нашага прыезду прадавец ужо тыдзень хварэла...

Але ёсць і добры прыклад у рабоце стацыянарнага пункта ў вёсцы Васілевічы, які таксама нядаўна ўзнавілі. Сюды прыязджаюць і жыхары суседніх вёсак. А хто не здужае — дапамажа сацыяльны работнік. Данута Ашуркевіч — адна з іх. За прадуктамі заходзіць штодзень. На гэты раз яна адвозіць заказы ў суседнюю вёску Кодзеўцы. Яе падшэфныя просяць купіць і мяса, і каўбасы, і крупы, і цукар. Вельмі задаволена, што ўдалося ўзнавіць работу крамы, якая доўгі час была закрыта. Прадавец Анжаліка Бычкоўская прызналася, што яе ўгаварылі стаць за прылавак. Але замяніць нават на водпуск таксама няма каму.

У любым выпадку незабяспечанымі жыхары вёскі не застануцца. Некалькі разоў на тыдзень сюды прыходзяць аўталаўкі як спажывецкага таварыства, так і прыватных гандляроў. Праўда, актуальным застаецца забеспячэнне лекамі, затое на вёсках працягнулі газ і з'явіўся інтэрнэт. Сацыяльны работнік са смехам дадае: «Бабкі злуюцца, што вельмі позна да іх дайшоў прагрэс».

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

### Кампетэнтна

**Дзяніс ПРАКОПЧЫК, першы намеснік дырэктара па гандлі і грамадскім харчаванні Гродзенскага філіяла Аблспажыўтаварыства:**

— Гандлёвыя аб'екты на вёсцы працуюць у стандартным рэжыме, аб масавым закрыцці гаворка не ідзе. У год спыняюць сваю дзейнасць 1—2 аб'екты, а ўсяго ў нашай сетцы 72 крамы. У раёне працуе 8 аўтакрам. Усе яны штодзень выязджаюць строга па графіку, зацверджаным райвыканкамам. Што датычыцца кадраў, тут таксама няма праблем. Гэта звычайная штатная сітуацыя, калі прадавец захварэў ці пайшоў у водпуск. Для замены мы маем рэзерв. І наогул, жыхары вёсак пільна сочаць за работай і магазінаў, і аўтакрам. Калі машына не даехала ці спазнілася крыху, адразу тэлефануюць і ў нашу арганізацыю, і ў райвыканкам, і ў сельскі Савет.

# ТАЦЦЯНІН ДЗЕНЬ





Лёс, верагодней за ўсё, выбраў жыхарку вёскі Цыганкі Таццяну Дзянісаву-Берашэвіч для дапамогі састарэлым аднавяскоўцам не выпадкова. У свой час не даў пакінуць малую радзіму, як рабілі яе равеснікі і аднакласнікі, потым спрыяў у працы ў сельскай гаспадарцы — была жывёлаводам, даіла кароў, пасля на пошце — дваццаць гадоў Таццяна адпрацавала ў паштовым аддзяленні. А цяпер яна, лічы, цэнтральная фігура для свайго і суседніх населеных пунктаў, бо сацыяльны работнік у невялікі вёсцы — вельмі запатрабаваная, патрэбная і своечасовая прафесія. Шэсць гадоў Таццяна шчыруе на сваёй чалавечнай пасадзе ў Сенненскім раённым Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання.

Пад апекай Таццяны дзевяць чалавек — тры сям'і па два чалавекі і тры адзінокія жыхары. Не толькі ў Цыганках — даводзіцца ездзіць на веласіпедзе ў вёскі Бор і Гуліна.

Сям'я з вёскі Бор Сцяпан Іванавіч і Валянціна Сяргееўна Ляўко — былыя суседзі Таццяны. Цяпер дапамагае ім — носіць ваду, дровы, мые падлогу, купляе прадукты ў краме і лекі ў аптэцы. Яшчэ адзін падапечны Таццяны — Іван Гарнак. «Памятаю, як прынесла для яго першую пенсію, — успамінае жанчына. — Не думала тады, што буду яму дапамагаць». Іван Несцеравіч жыве адзінока, амаль страціў зрок. Сацыяльны работнік прыходзіць да яго два разы на тыдзень, гатуе ежу, прыбірае. Гэтак і з іншымі падапечнымі. «Але кожны дзень думаю пра іх, а на тэлефаннай сувязі — пастаянна», — прызнаецца Таццяна.

Пра тое, што Таццяна незаменны, патрэбны, і, галоўнае, свой чалавек, найлепш сведчыць тое, што землякі абралі яе старэйшынай аж на пяць вёсак.

**Анатоль КЛЯШЧУК,**
**фота аўтара.**



ЗАНЯТАК ПА ДУШЫ

# «ЗАПРЭГЧЫ» МАРУ

**Часовыя захапленні могуць перарасці ў нешта большае**

**На ўездзе ў аграгарадок Шайтарава Верхнядзвінскага раёна мінакоў сустракае дэкаратыўная скульптура: швейная машынка, ад якой цягнецца «палатно», высаджанае кветкамі. На думку старшыні Шайтараўскага сельсавета Тацяны Разумнай, для іх мясцовасці гэта вельмі сімвалічнае ўпрыгажэнне. Каляровая стужка тканіны можа сімвалізаваць і аднаўленне таго, што ўжо было, і нешта абсалютна новае, створанае майстравітымі рукамі мясцовых жыхароў.**



## АДЦЕННІ СЛОДЫЧЫ

Вакол дома Ігара і Людмілы Касараўскіх акуратны кветнік, сваімі рукамі сужэнцы пабудавалі альтанку, лазню. З вясны да восені радуюць вочы дагледжаныя грады і сад.

Дом на льготных умовах дапамагла купіць дзяржава, калі ў сям'і нарадзілася трэцяе дзіця — дачушка Паліна. Не так даўно ў дзяўчынкі з'явіўся яшчэ і малодшы брацік.

— Вялікую сям'ю не планавалі, але вядома ж, што дзе трое, там і чацвёра. З чатырма дзецьмі клопату хапае, так што прывучалі з маленства любую работу рабіць разам. Старэйшыя хлопцы сталі «нянькамі» для малодшых дзяцей, муж дапамагае па гаспадарцы. Ніхто не дзеліць абавязкі на «жаночыя» і «мужчынскія», — расказвае Людміла.

Гаспадыня сама вырасла ў шматдзетнай сям'і. Маці ўвесь час на працы, гаспадарка вялікая, так што дзеці вучыліся самі сябе даглядаць. Вось і цяпер старэйшы сын не лічыць за дзіва памыць падлогу, а маленькая Паліна «дапамагае» маме на кухні.

Акрамя звыклых кашы і супоў Людміла гатуе і дэсерты. Пачалося ўсё з таго, што захацелася пацешыць малых салодкім. Кожны ласунак маладой мамы — сапраўдная скульптура: ад «класічных» кветкавых палян на круглай аснове, да калматых крэмавых сабачак, машынак і прынцэс у пышных сукенках. Ёсць і ўнікальныя работы для асаблівых імянніннікаў, якія не знойдзеш ні ў адной кандытарскай краме, напрыклад букет кветак або «кубак з півам».

— Бывае, што сябры просяць зрабіць торт да свята. Я распытваю аб пажаданнях пра смак і выгляд. Аднойчы гатавала торт на вяселле з кветкамі і фігуркамі, а потым чула, як госці дзяліліся ўражаннямі. Гэта падбадзёрвае, прыемна ведаць, што некаму твая праца прыйшлася даспадобы.

Кулінарыць Людміла па пакліку душы і за добрае слова. Напачатку да яе захаплення муж паставіўся насцярожана: ласункі адымаюць багата часу, ды і сродкі на спецыяльныя прыстасаванні для гатавання патрэбны. Але потым зразумеў, як важны для жонкі яе занятак. Зрэшты і сам мужчына знаходзіць час, каб дадаць дому ўтульнасці — дабудоўвае, рамантуе, майструе.

## ЛЕГКАНОГАЯ МАРА

У Верхнядзвінскі раён Уладзімір Азарка пераехаў з-пад Нясвіжа. Тады мужчына працаваў кіроўцам на меліярацыйных работах і займець уласную кватэру, хай і ў іншай мясцовасці, падавалася добрай ідэяй. Аднак гарадское жыццё і ўлюбёны занятак цяжка сумяшчаліся, таму Уладзімір набыў вясковую хату ў Шайтараўскім сельсавеце. Цяпер днём ён развозіць дзяцей па школах на аўтобусе, а вольны час аддае догляду за конямі. Іх, дарэчы, у гаспадарцы шэсць.

— Колькі сябе малым помню, заўсёды бацькі трымалі коней, — дзеліцца ўспамінамі Уладзімір. — Калі сюды пераехаў, то вырашыў, што таксама буду гадаваць коніка — для душы. А потым, як гэта бывае, пазнаёміўся з іншымі аматарамі, набыў яшчэ аднаго. Так паступова прыйшоў да думкі, што можна арганізаваць катанне, тым больш у людзей якраз з'явілася цікавасць да выездаў «пад даўніну».

Сябры падзяліліся досведам. З іх дапамогай Уладзімір змайстраваў брычку, купіў вупраж і збрую. Сельсавет дапамог афіцыйна зарэгістравацца дзейнасць як паслугі аграэкатурызму без магчымасці пражывання.

Цікава назіраць, як грацыёзныя жывёлы прыбягаюць на свіст гаспадара. Уладзімір тлумачыць, што чужых людзей гадаванцы не баяцца, бо ведаюць, што іх не пакрыўдзяць, наадварот, турысты часам прывозяць для іх пачастунак — садавіну ці агародніну. Сена на зіму даводзіцца купляць — нарыхтаваць столькі травы сваімі сіламі цяжка. Мясцовы хлебазавод у якасці корму выдзяляе рэшткі пасля выпякання хлеба, так званыя скарынкі.

Сама болей наведвальнікаў бывае летам, калі з горада вяртаецца моладзь і расійскія турысты зазіраюць на сельскую экзотыку. Як заўважае гаспадар, хлопцы да жывёл, звычайна, абыякавыя, а вось дзяўчаты часта становяцца добраахвотнымі памочнікамі і з задавальненнем клапоцяцца пра коней: дапамагаюць карміць, бінтуюць ногі.

— Калі першы раз запрагаў вазок у горад на свята, то хваляваўся нават больш, чым калі падаваў заяву на афармленне турыстычных паслуг. Было трывожна, бо з непрывычкі коні маглі спалохацца натоўпу, нечаканых гукаў. Я дома нават каляровыя шарыкі навязваў, каб хоць крыху звыклі, — усміхаецца Уладзімір.



Цяпер турыстычная конная траса праходзіць ад панадворка аматара з Шайтараўшчыны цераз лес да суседняй вёскі Барсукі. Маляўнічы маршрут дапамаглі пракласці работнікі лясгаса. Часта экіпаж заказваюць маладыя, каб праехаць на конях цераз мост.

## ТРЫ КРОКІ НАСУСТРАЧ

— Важна не адбіць у чалавека ахвоты займацца любімай справай, — разважае старшыня сельсавета Тацяна Разумная. — Мы гатовыя растлумачыць пэўныя юрыдычныя моманты, дапамагчы з афармленнем дакументаў, калі чалавек мяркуе стаць індывідуальным прадпрымальнікам або займацца справай проста так, без ухілу ў бізнес. Чым выдатныя людзі, якія знайшлі сябе ў пэўнай дзейнасці? Іх не трэба прасіць двойчы аб дапамозе, калі сельсавет шукае памочнікаў або праходзіць нейкае святочнае мерапрыемства. Адпаведна, і мы стараемся іх падтрымаць са свайго боку. Дапамагаем з дастаўкай будаўнічых матэрыялаў, кармоў, сочым, каб нашым актывістам прадпрыемствы не завышалі кошты на паслугі.

Цікава, што работа сельсавета з нядобранадзейнымі сем'ямі таксама грунтуецца на пошуку заняткаў. Першы пункт рэабілітацыі звязаны з індывідуальным падыходам. Праблемную сям'ю наведваюць медыцынскія работнікі, псіхолаг. Другі крок — гэта ўладкаванне на работу. Важна, каб падапечны меў пастаяннае месца працы і магчымасць зарабляць. Крок трэці — гэта агульнае вывучэнне праблемы і наладжванне спрыяльнага асяроддзя. Калі гаспадары дагледаюць гародчык, жывёлу, то ім ужо нецікава цягнуцца да чаркі.

— Заўважалі неаднаразова: калі ў чалавека ёсць блізкая сэрцу справа, то і на рабоце, і дома ён будзе прыкладам, — кажа Тацяна Разумная. І паспрачацца з ёй цяжка.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

ТЭНДЭНЦЫІ

# АПТЫМІЗАЦЫЯ НА КАРЫСЦЬ АДУКАЦЫІ

**Наш карэспандэнт пабываў на святкаванні 100-й гадавіны найстарэйшай школы Гарадоцкага раёна. Педагогаў і вучняў павіншаваў старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ *(на фота)*, кіраўнікі райвыканкама.**

— Прыгожае свята! Не кожны раён можа ганарыцца тым, што ёсць такая ўстанова адукацыі з багатай гісторыяй. Насамрэч гісторыя школы — гісторыя краіны, — адзначыў Уладзімір Цярэнцьеў.

У Вархоўскай школе менш за дваццаць вучняў. А ў вёсцы ўсяго каля 240 жыхароў. Навучальная ўстанова сёлета атрымала статус базавай школы-садка. Старшакласнікаў возяць на школьным аўтобусе на заняткі ў Бычыху. Там умовы не горшыя, чым у горадзе. Пры гэтым і ў Вархоўскай школе быў рамонт, пасля якога тут проста цудоўныя сталовая, класы, санітарныя вузлы. Многае зроблена за сродкі, якія зэканомілі ў выніку аптымізацыі.

Паводле слоў **старшыні Гарадоцкага райвыканкама Пятра КАРАБАЧА**, аптымізацыя не робіцца толькі дзеля таго, каб яе правесці. Зразумела, калі вучняў мала, іншага выйсця няма...



У раёне на сёння дзевяць школ, у тым ліку сем сярэдніх. У іх каля 2,1 тысячы вучняў. Парк школьных аўтобусаў папоўняць тры машыны.

У наступным годзе ў сярэдняй школе ў пасёлку Езярышча будзе зроблены капітальны рамонт. Ужо даўно ў гэтым ёсць патрэба.



Як канстатаваў старшыня абласнога Савета дэпутатаў, прыкладна 25 мільёнаў рублёў, зэканомленых у выніку аптымізацыі на Віцебшчыне, накіруюць на развіццё адукацыі.

— Купляем аўтобусы, абсталяванне, капітальны рамонт робім. За апошнія гады многае ўжо ажыццявілі. І ў такіх маштабах, якіх нават педагагічныя работнікі не памятаюць, — дадаў Уладзімір Цярэнцьеў.

Сёлета на базе адной са школ адкрылі скаладром, у другой — барцоўскую залу. Як гаворыцца, найлепшае пацверджанне сказанаму.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

НАШЫ ДЗЕЦІ

# ЗАБРАЦЬ НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ



## Бацькі п'юць, не ведаюць, як выхоўваць малых, ці маюць даўгі

**Усё гэта падставы для таго, каб прызнаць дзяцей тымі, хто трапіў у сацыяльна небяспечнае становішча. А ад такога статусу часта недалёка і да наступнага кроку, якім дзеці з такой сям'і прызнаюцца тымі, хто мае патрэбу ў дзяржаўнай абароне, і забіраюцца ад бацькоў. Перш чым прымаць радыкальныя меры, у рэгіёнах стараюцца выкарыстоўваць мясцовыя асаблівасці, каб абысціся меншымі стратамі. У Карэліцкім раёне работнікі службы па справах непаўналетніх, забраўшы дзіця ад п'яных бацькоў, стараюцца пакінуць яго ў сваякоў, не дазваляюць адключаць электрычнасць за даўгі, збіраюць інфармацыю пра звольненых. А малым, якія апынуліся пасля адабрання ў бальніцы (дзеці да трох гадоў), дапамагаюць усёй грамадой, бо ўсе ведаюць адно аднаго.**

### Пад ярлыком «сацыяльна небяспечны»

Указ Прэзідэнта №18 аб абароне дзяцей, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, дзейнічае амаль 11 гадоў. На жаль, не заўжды атрымліваецца чаканы вынік. Магчыма, таму, што дзяцей раней забіралі больш сталых, якія ўжо ўвабралі ў сябе асацыяльныя правілы жыцця бацькоў. Ніхто не адмяняў і дзеянне генетычнай прыхільнасці да згубы ў бутэльцы. Тым не менш стараюцца выправіць усіх: і маму з татам, і дзетак, якіх забіраюць з-пад уплыву небарак-бацькоў ва ўсё меншым узросце, расказваюць у Карэліцкай камісіі па справах непаўналетніх.

Часцей за ўсё «статус» сацыяльна небяспечнай сям'я атрымлівае праз алкагалізм бацькоў, аднак гэта не азначае, што на наступны ж дзень у іх прыйдуць забіраць малых. Забраць дзяцей з сям'і можна досыць мірным шляхам, калі спецыялісты доўгі час ушчуваюць і працуюць з неўладкаванымі сем'ямі, пакуль не становіцца зусім відавочна, што без штуршка ў выглядзе адабрання малых на бацькоў не паўплываць.

— Усе свае такія сем'і мы ведаем у твар. З імі працуюць псіхолаг, педагог, старшыня сельсавета, спецыялісты сацыяльна-педагагічнага цэнтра, медыкі, — расказала **Вольга БАЗАР, намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх Карэліцкага раёна.** — Аднак паколькі алкагалізм — справа невылечная, не заўсёды такая работа прыносіць чаканыя вынікі. Бацькі працягваюць піць, пакідаюць малых без нагляду. І мы прымаем рашэнне прызнаць, што дзеці маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне. Падаецца хадайніцтва школы аб адабранні дзяцей, і камісія па справах непаўналетніх разглядае ўсе абставіны разам з актамі абследавання, зафіксаванымі сігналамі аб небяспецы ў сям'і і іншымі дакументамі і прымае канчатковае рашэнне. І вось тады, пасля адабрання малых, з бацькамі працуюць больш жорстка.

Сярод праблемных сем'яў ёсць тыя, дзе дзяцей выхоўваюць бацькі з асаблівасцямі псіхічнага або фізічнага стану.

— Такія, як мы кажам, вялацякучыя сацыяльна небяспечныя сем'і ў нас могуць існаваць гадамі, — удакладніла Вольга Базар. — У іх дамах, як правіла, не прыбрана, бацькі праз свае асаблівасці не ведаюць, як у поўнай меры клапаціцца пра дзяцей. Але ж яны не п'юць, і не іх віна, што яны нечага не разумеюць, таму і няма падстаў забраць у іх малых. Такім сем'ям дапамагаюць жыць і спецыялісты, і навакольныя.

### Хто песні пяе, хто баіцца вярнуцца

Іншая справа, калі бацькі сыходзяць у запой. Ад таго, наколькі хутка дарослыя пакоцяцца на дно бутэлькі, залежыць і час, які пройдзе з моманту атрымання сям'ёй статусу сацыяльна небяспечнай да адабрання малых.

— Некаторых гэты статус нібыта ўзварушвае, яны выпраўляюцца. Але калі бацькі «не прасыхаюць» і іх паводзіны ў гэтым стане могуць пагражаць жыццю ці здароўю дзяцей, мы забіраем малых, — тлумачыць Вольга Базар.

Тэрмінова забіраць дзетак, калі бацькі ў запоі, прыходзіцца, як правіла, у позні час. Калі здараецца гулянка, суседзі тэлефануюць у міліцыю ці нават дырэктару мясцовай школы, каб расказаць пра дэбош. Супрацоўнік міліцыі выязджае на выклік, бачыць, што пагроза дзецям сапраўды існуе, і паведамляе пра гэта намесніку старшыні камісіі па справах непаўналетніх і спецыялісту па ахове дзяцінства, — адзін ён дзяцей не забірае.

**За бягучы год з сем'яў Карэліцкага раёна забралі 26 дзяцей. На 1 кастрычніка 11 дзяцей прызнаны тымі, каму патрабуецца дзяржаўная абарона. Дарослыя з 9 сем'яў пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Каля 50 сем'яў маюць статус сацыяльна небяспечных.**

— Часцей за ўсё мы ўжо ведаем, пра якую сям'ю ідзе гаворка, калі атрымліваем начны выклік, — каменціруе Вольга Дзмітрыеўна. — Мы ведаем і іх сваякоў і стараемся перш за ўсё адвезці дзіця да той жа бабулі, калі ўпэўнены ў яе паводзінах і ў тым, што яна гатовая паклапаціцца пра ўнука да прыняцця канчатковага рашэння.

Раней усіх адабраных у начны час дзяцей ад нябачнага дзеля адпраўлялі ў дзіцячае аддзяленне Карэліцкай раённай бальніцы. Апошні час дзеці да трох гадоў трапляюць на нейкі перыяд у бальніцу, старэйшыя — адразу ў сацыяльна-педагагічны цэнтр раёна, дзе працуе прытулак.

— Пра дзетак, што трапляюць у бальніцу, у нас клапоцяцца не толькі медперсанал, але і матулі, якія разам са сваімі там ляжаць. У прытулак такія малыя прыязджалі ўжо з клункамі адзення, цацак, прадуктаў, — згадвае спецыяліст. — За гады дзеяння ўказа ў нас лічаныя адзінкі трапілі ў інтэрнаты. Як правіла, дзяцей прымаюць у сем'і тут, у раёне. Было і такое, што адна з былых дырэктараў прытулку сама ўзяла ў сям'ю хлопчыка таго ж узросту, што і ўласны сын. Цяпер той малы даўно вырас, але дагэтуль падтрымлівае сувязь з прыёмнай маці.

Дзеці, якіх пасярод ночы вывозяць з бацькоўскага дому, рэагуюць па-рознаму, і далёка не ўсе чапляюцца за матуліну спадніцу.

— Здараецца, што дзіця забярэш з сям'і, дзе сварка, лямант, сам у стрэсе выйдзеш адтуль, а малы сядзе ў машыну і песні спявае, бо адчуў сябе ў бяспецы, — успамінае Вольга Базар. — А параўнальна нядаўна мы забралі пяцярых дзяцей са шматдзетнай сям'і другі раз за крыху больш чым год. Пасля першага здарэння бацькі ўзяліся за розум, не пілі, наведвалі ў цэнтры малых, і дзяцей вярнулі. А пасля так запілі, што не змаглі спыніцца, цяпер маці ў ЛПП, і бацькі пазбаўлены правоў. Дзеці баяліся, як бы іх зноў не вярнулі бацькам. Да гэтай гісторы падключыліся сваякі, і, напэўна, дзяцей аддадуць ім пад апеку.

### Адключым газ!

У апошні час з'яўляецца шмат артыкулаў, дзе канстатуюць, што дзяцей забралі ў бацькоў праз запазычанасць за «камуналку» і адключаныя камунікацыі. У Карэліцкім раёне, настойвае спецыяліст, такога не здарыцца.

— Нам званяць і з мясцовых электрасетак, і з газгаза, кажуць, што маюць падставу адключыць свет ці газ. Але без нашага дазволу яны не маюць права зрабіць гэта ў сем'ях, дзе на выхаванні ёсць дзеці, — запэўнівае Вольга Базар. — Штомесяц мы атрымліваем спісы даўжнікоў і працуем з імі. Калі лічым, што акрамя цяжкага матэрыяльнага становішча ёсць іншыя прычыны непакоіцца, забіраем дзяцей і дазваляем адключыць камунікацыі. Калі ж не — дапамагаем працаўладкавацца, каму яшчэ можна — аказваем матэрыяльную дапамогу. Нават калі яны на заробкі ў Расію з'язджаюць, а пасля з пустымі кішэнямі вяртаюцца, угаворваем іх былое кіраўніцтва прыняць назад на працу. Да апошняга з імі працуем.

Усім арганізацыям і прадпрыемствам раёна прадпісана адразу паведамляць ва ўстанову адукацыі, дзе вучацца дзеці, пра звальненне бацькоў з небяспечных сем'яў. У кастрычніку, дарэчы, у даўжнікі, здараецца, трапляюць нават звычайныя шматдзетныя сем'і, якія тлумачаць, што збіралі дзяцей у школу, вось на «камуналку» і не хапіла.

У Карэліцкім раёне не высяляюць даўжнікоў у памяшканні меншых памераў, каб розніцай пакрыць даўгі. На гэта некалькі прычын. Па-першае, у Карэлічах недастаткова падменнага жылля. Па-другое, кватэра ці дом, дзе яны пражываюць, настолькі занядбаныя, што наўрад ці нехта захоча іх арандаваць.

**Ірына СІДАРОК.**
sidarok@zviazda.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 17 кастрычніка 2017 года.**